83 83(4Беи)я73
Б-
УДК 821.161.3.09-93(075.8)
ББК 83.3(4Беи)я73
Б43

Аўтары: А. М. Макарэвіч, М. Б. Яфімава, Л. Г. Бараноўская, А. І. Бельскі, Т. І. Борбат, А. Л. Верабей, І. Дз. Воюш, В. І. Караткевіч, Я. І. Клімуць, І. М. Кульбянкова, А. Э. Сабуць, Вал. М. Смаль, В. М. Смаль, А. В. Шарапава

Рэцэнзенты: кафедра беларускай літаратуры Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава; доктар філалагічных навук, прафесар *А. І. Гараніна*

*Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Узнаўленне ўсёй кнігі ці любой яе часткі не можа быць здзейснена без дазволу выдавецтва.*

БИБЛИОТЕКА
БрГУ им.А.С.Пушкина
7078

**Беларуская** дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. /
Б43 А. М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 688 с.
ISBN 978-985-06-1440-7.

Падрыхтаваны ў адпаведнасці з тыпавой праграмай курса «Беларуская дзіцячая літаратура».

Асвятляюцца перыяд зараджэння беларускай дзіцячай літаратуры, фарміраванне традыцый стварэння кніг навучальна-пазнавальнага зместу.

Складаецца з трох раздзелаў: «Гістарычныя перадумовы ўзнікнення дзіцячай літаратуры», «Беларуская дзіцячая літаратура першай паловы XX ст.», «Беларуская дзіцячая літаратура другой паловы XX ст.». Значная ўвага надаецца пытанням тэорыі літаратуры, асаблівасцям літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.

Для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 821.161.3.09-93(075.8)**
**ББК 83.3(4Беи)я73**

**ISBN 978-985-06-1440-7**
© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 2008

многія творы, што і сёння прываблiваюць чытачоў займальнасцю, мяккім гумарам, пазнавальнасцю, адсутнасцю маралізатарства і, галоўнае, шчырым захапленнем светам дзяцінства.

### Тэма 6.5. МАКСІМ ТАНК

### (Яўген Іванавіч Скурко)
### (1912–1995)

Максім Танк нарадзіўся ў цудоўным нарачанскім краі на Міншчыне 17 верасня ў вёсцы Пількаўшчына. Маляўнічая прырода Мядзельшчыны, цікавыя і духоўна багатыя людзі нарачанскай зямлі былі яго і музай, і крыніцай натхнення, што жывіла паэзію, давала разнастайны матэрыял для творчасці. Паказальна, што прызнаны класік беларускай літаратуры выявіў свой талент не толькі ў творах для дарослых, але і ў творах для дзяцей, моладзі.

У дзяцінстве будучаму паэту давялося перажыць шмат выпрабаванняў і нягод, якія гартавалі характар нязломнага змагара за народнае шчасце. Бежанства ў гады першай сусветнай вайны, жыццё ў Маскве ў змрочным падвале, адсутнасць магчымасці вучыцца на роднай мове на радзіме, рэвалюцыйнае падполле – гэта этапы таго пакручастага шляху, які спрыяў фарміраванню ў Я. Скурко высокага пачуцця грамадзянскай адказнасці. Знаёмства з мастацкай літаратурай пачалося з кніг на рускай мове (творы А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Някрасава, М. Гогаля), потым на польскай (творы А. Міцкевіча, Ю. Крашэўскага, М. Канапніцкай, Э. Ажэшкі). Толькі ў 1925 г. Яўген пазнаёміўся з вершам Я. Купалы «Горы ды каменні», надрукаваным на роднай мове ў беларускім календары.

Пісаць па-беларуску М. Танк, па ўласных успамінах, пачаў пад уплывам паэзіі Я. Коласа і Я. Купалы, а таксама народных казак і песень: «*Яшчэ будучы малым, я не раз прыслухоўваўся, як пялі жнеі: доўга, працяжна, быццам нашы нізінныя рэкі, звонячы нізка звісаючай лазой, алешнікам, чаротам, калышучы срабрыстыя россыпы сонца, пераліваючыся вясеннім разлівам, парываючы сваёй бязмернай глыбінёй пачуцця. І не ведаю, чаму,*

*пачуўшы народную песню, не толькі заслухоўваюся, але мне хочацца глянуць вачамі ў яе»*[1]. Першыя спробы пяра юнага паэта адносяцца да часу вучобы ў Віленскай рускай і Радашковіцкай беларускай гімназіях. Пад уплывам фальклору быў напісаны адзін з першых яго твораў: зарыфмаваная легенда аб Шкленікаўскім возеры, пачутая яшчэ ў гады вучобы ў польскай пачатковай школе. Я.І. Скурко прайшоў суровую школу рэвалюцыйнай барацьбы, зведаў арышты, турмы, катаванні. Невыпадкова свае першыя спробы пяра малады паэт падпісваў псеўданімамі Аўгень Бура, А. Сівер, А. Граніт, якія дапамагаюць зразумець бунтарскі, змагарскі характар паэзіі Я. Скурко і яго героя – мужнага, непахіснага, загартаванага гадамі змагання за правы заходнебеларускага народа. Псеўданімам Максім Танк упершыню быў падпісаны верш «Заштрайкавалі гіганты-коміны», апублікаваны ў газеце-аднадзёнцы «Беларускае жыццё», якую легальна выдалі 7 красавіка 1932 г. заходнебеларускія камуністы ў Львове. Гэты літаратурны псеўданім дакладна перадаваў і рамантычны характар ранняй (давераснёўскай) творчасці паэта, яго прагу самасцвярджэння, духоўна-грамадзянскай актыўнасці і яе рэалістычную скіраванасць. Паэт-патрыёт разам з народам горача адстойваў на «Крэсах Усходніх» права беларусаў на нацыянальнае вызваленне, за што тройчы трапляў у Лукішскую турму. Пазней М. Танк напіша: «*Юнацтва мінула // На сцежках этапных // У пошуках шчасця, // Штодзённага хлеба, // Незакратаванага сонца і песні*»[2]. Ад ідэалаў, выказаных у гэтым вершы, М. Танк ніколі не адступаўся: ні ў творчасці, ні ў жыцці. Шчыра і аддана ён служыў народу і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і ў мірны час, калі сумяшчаў творчую дзейнасць з працай у СП БССР і Вярхоўным Савеце БССР.

М. Танк з самага пачатку творчага шляху адчуў душэўную патрэбу пісаць для дзяцей. Такі напрамак у творчасці стаў грамадзянскім абавязкам пісьменніка. У часы суровага змагання на заходнебеларускіх барыкадах паэт-рэвалюцыянер стварыў мноства цудоўных казак, што захапляюць юных чытачоў і сёння. Першыя яго творы для

---

[1]*Бугаёў, Дз.* Паэзія Максіма Танка / Дз. Бугаёў. Мінск, 2003. С. 30, 31.
[2]*Танк, М.* Дарога, закалыханая жытам / М. Танк. Мінск, 1976. С. 22.

дзяцей з'явіліся ў 1937 г., але і да гэтага ў некаторых вершах паэта ўжо гучала тэма дзяцінства. Напрыклад, у вершы «Песня кулікоў», напісаным у 1936 г. да дня беларускай культуры ў Вільні, у цэнтры ўвагі паэта – лёсавызначальнае для заходнебеларускага народа пытанне: «*Што <...> будзе з нашымі дзяцьмі?..*»

У 1930-я гг. у перыядычным друку Заходняй Беларусі з'явіўся шэраг казак і вершаў М. Танка, адрасаваных моладзі. Яны друкаваліся ў часопісах «Беларускі летапіс», «Снапок» і «Калоссе». У заходнебеларускіх выданнях пабачылі свет казкі: «Сказ пра Вяля», «Казка пра Музыку», «Дзед і шчупак», «Казка пра Мядзведзя», «Мухамор». М. Танк нездарма звярнуўся да жанру літаратурнай казкі, выкарыстоўваючы пры гэтым фальклорны сюжэт. Казкі, легенды, паданні, у большасці пачутыя ім яшчэ ў дзяцінстве ад матулі, ад дзеда, які быў цудоўным апавядальнікам, пазней сталі найважнейшым падмуркам развіцця літаратурных здольнасцей паэта, яго самабытнага творчага голасу. У 1939 г. М. Танк у дзённіках адзначаў, што беларуская народная казка можа служыць багатай крыніцай цікавых тэм для оперы і балета. Ён выказаў слушную думку аб тым, што гэты жанр вуснай народнай творчасці з'яўляецца неацэнным скарбам для прафесійнага мастацтва. Разважаючы пра ролю казкі ў выхаванні дзіцяці, М. Танк пісаў: «*Казка ж акрыляе чалавека, робіць яго больш моцным і добрым чалавекам, вучыць яго стойкасці ў цяжкія гады выпрабаванняў*»[1]. Разнастайныя па тэматыцы, праблематыцы і мастацкіх асаблівасцях творы М. Танка для юных чытачоў цесна звязаны з фальклорам. Паэт творча перапрацоўваў народныя сюжэты, а таксама ствараў свае арыгінальныя палотны, у якіх зноў жа выкарыстоўваў традыцыі фальклору ў фабуле, мове, абмалёўцы вобразаў. Усе казкі гэтага мастака слова вылучаюцца выхаваўча-пазнавальным пафасам.

У сваіх казках М. Танк закранаў розныя маральна-этычныя праблемы. Напрыклад, у казцы «Мухамор» (1937) высмейваецца хвалько Мухамор, які лічыў, што «*мог бы смела быць паслом або нават і царом*». Упэўнены, што роўнага па прыгажосці яму ў лесе няма, ён вы-

[1]*Танк, М.* Новому поколению / М. Танк // Детская литература. 1972. № 9. С. 2.

хваляўся: «*Боты, гузікі гараць, – // Яму пары не дабраць // Пад ялінай, пад сасной // Ні багаццем, ні красой*»[1]. Аднак калі ў лес прыйшлі дзеці, усё стала на сваё месца: яны пазбіралі добрыя грыбы, а мухамор – «*дзяцюк на цэлы свет*» – нікому не спатрэбіўся: як кажуць у народзе, «глядзець – прыгожы, ды не гожы». Казка вучыць юных чытачоў рэальна ацэньваць сябе і не выхваляцца перад іншымі. Пазнавальнае значэнне твора ў тым, што дзеці даведаюцца, якія растуць грыбы ў беларускім лесе: казляк, сыраежка, падасінавік, рыжык, ваўнянка, гашчавік, баравік, апенька. Аўтар стварыў запамінальны абразок ляснога жыцця, звярнуў увагу не толькі на грыбы, але і на розную жыўнасць: аваднёў, камароў і мураў'ёў.

Свет роднай прыроды мастак паэтызуе і ў «Казцы пра Мядзведзя» (1937). Паэт выказвае захапленне фальклорнымі скарбамі нашага народа і імкнецца выклікаць у дзяцей гонар за сваю Бацькаўшчыну: «*А там, за сасновым // За лесам, за борам, // Як золатам сінім, // азёры! //\ А глянеш навокал – // Такая краіна: // Дзе ступіш – то рэха, // То казка, быліна...*» [17].

Тут М. Танк нават канкрэтызуе месца дзеяння, згадваючы нарачанскія мясціны і Белавежскую пушчу. У гэтай казцы больш багатая сістэма вобразаў. Сярод дзеючых асоб твора ёсць не толькі мядзведзь, але і такія драпежнікі, як воўк і ліса, прысутнічае і сімвал Беларусі – зубр, а таксама паказаны казёл, зайцы, вавёрка, варона, сарока, певень, цецерукі, дзятлы, нават шэршні ды асвянкі. Твор напісаны ў традыцыях беларускіх народных казак, у якіх жывёлы і птушкі з'яўляюцца алегарычнымі вобразамі. Яны хоць жывуць і дзейнічаюць па законах свайго свету, але маленькія чытачы ўспрымаюць стасункі лясных істот як падобныя да складаных адносін людзей у грамадстве. У традыцыйна фальклорным плане паказаны і галоўны герой казкі мядзведзь. З гумарам асуджаецца ў казцы гультайства, прыстасавальніцтва Мядзведзя. Ён паўстае перад чытачамі хітрым прайдзісветам, які вырашыў знайсці жонку працавітую і з добрым пасагам, каб і надалей гультаяваць і быць сытым зімой: «*Эх, важныя*

---

[1]*Танк, М.* Блікі сонца: Вершы, казкі / М. Танк. Мінск, 1997. С. 5. Далей спасылкі на гэтае выданне даюцца непасрэдна ў тэксце з пазначэннем нумара старонкі з яго.

*дзеўкі, // Былі б гаспадыні, // Каб мелі каўбасаў, // Курэй, саланіны. //\ Нашто і шукаць бы // Што недзе другое, – // Было б у Мядзведзя // Жыццё залатое»* [10].

Мядзведзевы сваты воўк і ліса змаглі знайсці выгадную нявесту – нястомную ў працы вавёрачку: «*Скакуха вясёлая // І гаспадыня, // Якая збірае // Арэхі ў ляшчынах, //\ Насыпала поўныя куфры, // Як лёду...*» [11].

Такі мезальянс справядліва выклікае не толькі смех, але і абурэнне: вялізны і дужы мядзведзь хоча жыць за кошт маленькай вавёрачкі. Сам жа кудлаты «*не мае ні пчол, ні гарода*». На ім просценькая кашуля, стаптаныя лапці і ў руцэ сукаваты кій. Адзінае, што ўмее добра рабіць «*жаніх*», – гэта скакаць пад гукі лясных музыкаў. Канфлікт казкі вырашаецца ў традыцыях народнай маралі: хітрасць пакарана. Калі касалапы з'еў вавёрчыны запасы і занудзіўся, дык знайшоўся той, хто змог яго «вылечыць» ад ляноты і гультайства: « <...> *Лячыў Цыган // Брагай-сівухай да рана; //\ Яшчэ паіў зеллем // Салодкім, як мёдам, // Спаіўшы, Мядзведзя // Прыкуў да калоды. //\ Пазней яму ўсыпаў // Бярозавай кашы, // Павёў яго цешыць // Людзей па кірмашах*» [15–16].

З тае пары кудлаты цудоўна асвоіў працу скамароха, цешыў людзей на кірмашах, за што атрымліваў жаданыя ласункі. У казцы паказана, што праца здольная змяніць характар чалавека. Аўтар таксама акцэнтуе ўвагу маленькіх чытачоў на пэўных заганах, ухваляе працавітасць, жаданне жыць з плёну сваёй працы, гатоўнасць да ўзаемадапамогі.

«Казка пра Мядзведзя» мае таксама і пазнавальнае значэнне. З яе маленькія чытачы даведваюцца пра норавы і звычкі лясных жыхароў (напрыклад, чаму вавёрка хавае свае арэхі). На падставе твора дзеці атрымліваюць элементарныя ўяўленні пра нормы паводзін, узаемаадносіны людзей, пра асобныя бакі жыцця і побыту чалавека. Паводле беларускага вясельнага абраду ў казцы адлюстраваны заручыны і само вяселле; тут згадваюцца народныя музычныя інструменты: цымбалы, бубны, гармонік; госці на вяселлі танцуюць нацыянальны танец «Лявоніха». У цэлым гэтая вершаваная казка гарманічна спалучае ў сабе глыбокі ідэйны сэнс і станоўчую эмацыйную экспрэсію. Аўтар паэтызуе свет, але разам з тым да-

водзіць дзецям, што ў паўсядзённым жыцці прысутнічаюць не толькі дабрыня, любоў і пяшчота, але і сум, зайздрасць, гультайства, зласлівасць – усё тое, чаго неабходна асцерагацца.

Вобраз героя-змагара сустракаецца ў творах М. Танка і для дарослых, і для дзяцей. Шырокавядомая казка «Сказ пра Вяля» была напісаная ў 1937 г., калі за плячыма паэта ўжо назапасіўся даволі значны вопыт рэвалюцыянера-падпольшчыка. Вобраз Вяля быў духоўна блізкі аўтару самаахвярнасцю і настойлівасцю ў адстойванні народных інтарэсаў. Спалучэнне рэальнага і фантастычнага дазволіла М. Танку стварыць уласную мастацка-філасофскую мадэль свету, у цэнтры якой знаходзіцца ў мірным жыцці селянін-працаўнік, у часы ліхалецця – воін, абаронца пакрыўджаных. Як і ў беларускіх народных казках, Вяль з'явіўся на свет незвычайным чынам: селянін Скіба выараў яго з баразны. Гэтая істотна важная дэталь падкрэслівае крэўную роднасць асілка са сваёй зямелькай-маці.

Хлопчык, як і належыць казачнаму герою, надзіва хутка рос і набраўся незвычайнай фізічнай сілы. У малым узросце Вяль дапамагаў бацькам па гаспадарцы, а калі падрос, пайшоў змагацца са злом. У адрозненне ад гераічных казак ці былін, у М. Танка зло персаніфікуецца, яно выступае не ў вобразе нейкіх міфічных істот (напрыклад, Цмока), а ў абліччы спрадвечных крыўдзіцеляў народа – паноў і іх памагатых. Барацьба Вяля і яго войска з князем – гэта таксама і змаганне працоўнага народа за справядлівасць і годнае жыццё: «*Усё радзяць, калі князя яны зломяць, // Калі межы-абручы з зямлі сарвуць, – // Колькі будзе ў іх пшаніцы і саломы, // Як яны свабодна зажывуць!*»[1]. Не пакваліўся асілак нават на вялікія грошы, не адмовіўся ад пачатае справы і назаўсёды застаўся ў памяці народнай як сімвал нязломнага барацьбіта за праўду: «*Яго сэрца крыгі часу не сатруць; // Ён у шуме ветру, у калоссях жыта, // Як жывы гавора пераззвонам струн...*»[2]. У «Сказе пра Вяля» М. Танк казачную гісторыю напоўніў значным сацыяльным зместам.

---

[1]*Танк, М.* Збор твораў: у 6 т. /М. Танк. Мінск, 1978. Т. 1. С. 148.
[2]Тамсама. С. 152.

«Казка пра Музыку» (1938) пераклікаецца з папярэднім творам і ў знешне-фабульным матэрыяле (тут паэт уводзіць вобраз асілка і паказвае змаганне народа супраць несправядлівасці і ўціску), і ў ідэйна-эстэтычных прынцыпах адлюстравання рэчаіснасці. М. Танк выказвае сваё разуменне сутнасці чалавечага існавання ў яго цеснай спалучанасці з народнымі ўяўленнямі пра дабро і зло. Праблемы, закранутыя аўтарам у «Казцы пра Музыку», з'яўляюцца для чалавека спрадвечнымі актуальнымі філасофскімі пытаннямі пра сэнс чалавечага быцця. Лёс галоўнага героя Музыкі – гэта не толькі прыклад сапраўды патрыятычнага, альтруістычнага служэння народу і Бацькаўшчыне, але і пошук духоўных асноў, якія дазваляюць людзям выжыць у самых складаных сітуацыях, рэалізаваць свае здольнасці і талент. Аўтар спалучае фальклорны сюжэт з рэальнай жыццёвай асновай, што робіць твор змястоўным, ідэйна і эмацыйна насычаным. Юны герой Музыка, вяртаючы сваю жалейку, украдзеную царскімі прыслугачамі, духоўна ўзвялічваецца да казачнага волата. Хлопчык-сірата, які *«не меў <...> ні двара, ні гароду; толькі сярмяжку старую»*, не прадае сваю музыку ні за якія грошы. Гэта духоўна ўзвышае героя, надае яму якасць высокага маральнага эталона. Музыка становіцца сімвалам жыццястойкасці, прыкладам моцы духу. Нездарма яго непаўторнае, чарадзейнае гранне абуджала і падтрымлівала народ: *«<...>Кожная песня яго // Сілы ўсім дадавала, // Шмат будзіла надзей, // Беднякоў і сірот саграва́ла»* [19].

У «Казцы пра Музыку» М. Танк асэнсоўвае важную для кожнага творцы праблему мастака і мастацтва, вырашэнне якой дазваляе яму вызначыць сваё творчае крэда. Без музыкавага грання *«не чуваць ніякіх песняў, не смяюцца людзі даўно»*, таму вяртанне хлопцу жалейкі становіцца агульнанароднай задачай. На дапамогу яму прыходзяць і Араты, які *«потам ніву засявае»*, і Волат, які *«горы крышыць, ломіць і з далінамі раўняе»*, і Асілак, які *«днём і ноччу ўе пяньковыя аборы»*, і Вяль, які *«разганяе дратаванай пугай статак цёмных хмараў»*. Далейшыя драматычныя калізіі з элементамі фантастыкі ўдала ўзмацняюць гераічнае гучанне твора. Таму фальклорная аснова твора паглыбляе ідэйна-мастацкую задачу ўслаўлення непадкупнасці сапраўднага мастацтва і непераможную сілу народнага духу.

У «Казцы пра Музыку» найбольш ярка ў параўнанні з іншымі творамі М. Танка для дзяцей даверасне́ўскага перыяду выявілася паэтызацыя роднага краю. Аўтарскае ўменне панарамна адлюстроўваць краявіды Беларусі, перадаваць шматколерную прыгажосць навакольнай прыроды не можа не выклікаць у юных чытачоў лепшых пачуццяў да сваёй Радзімы. Крылатыя, добра вядомыя ўжо словы з гэтай казкі: «*Братцы! Тут зямля такая!*», – ёміста ілюструюць майстэрства М. Танка сказаць сцісла і адначасова грунтоўна.

Тонкім гумарам, цёплым лірызмам, уменнем зацікавіць юных чытачоў займальным сюжэтам вылучаецца таксама і казка «Дзед і шчупак» (1937). У гэтым творы няма характэрнага для казкі маралізатарства і павучальных інтанацый, прыярытэт аддаецца найперш выхаванню ў дзяцей эстэтычнай чуйнасці, умення ўбачыць казачна-незвычайнае ў паўсядзённым жыцці. У казцы, здавалася б, зусім немудрагелісты сюжэт: шчупак абхітрыў дзеда-рыбака і вылавіў усю яго прынаду. Аднак, калі ў якасці прынады выступаюць зоркі, то навакольны свет і прырода становяцца зачараванымі і таямнічымі. Шчупак тут нагадвае нейкага чараўніка: «*Перш захопіць Сітца, // А пазней – Мядзведзіцу, // Вып'е сцежку зорную // Вясняных сноў, // Выцягне з-пад сетак // Абаранку месяца // І зноў, ціха кружачы, // Ападзе на дно*» [48].

Функцыя падобных твораў найперш эстэтычная, дзеці вучацца адчуваць паэтычнасць малюнкаў прыроды, заўважаць шматколернасць навакольнага асяроддзя. Гэтае мастацкае палатно дапаможа юнаму чытачу спасцігнуць метафарычнасць, незвычайнасць літаратурнага вобраза.

У гады Вялікай Айчыннай вайны М. Танк не пісаў для юных чытачоў. Аднак некаторыя творы гэтага перыяду пазней трывала ўвайшлі ў дзіцячае чытанне, як, напрыклад, верш «Родная мова». Актыўнае асваенне пісьменнікам нівы беларускай дзіцячай літаратуры зноў пачалося ў 1945 г. У сям'і паэта гадаваліся сын і дзве дачкі. М. Танк быў добрым сем'янінам: ён шчыра і аддана любіў жонку Любоў Андрэеўну і дзяцей. Нават юныя героі некаторых твораў носяць імёны дзяцей паэта – дачушак-двайнятак. Варта прыгадаць Верачку з мастацкіх палотнаў «Сярод лясоў наднёманскіх» і «Зімовыя прыгоды», а таксама Ірынку з вершаў «Сняжынкі» і «Ірынка».

У год перамогі над фашызмам з'явіліся творы, якія ўзбагацілі беларускую дзіцячую класіку. Асабліва папулярная ў юных чытачоў казка «Сярод лясоў наднёманскіх». Казка «Галінка і верабей» паводле сваёй функцыянальнасці бліжэй да забаўлянак, таму выклікае ў дзіцяці станоўчыя эмоцыі і бадзёры настрой. У творы расказваецца пра тое, як галінка-вярбінка не хоча калыхаць дзяцей вераб'я; і ніхто яе не можа прымусіць гэта рабіць, бо ўсе ў лесе адмаўляюцца выконваць свае абавязкі. Нечым гэта нагадвае сюжэт «Блытаніны» К. Чукоўскага. Аднак, калі ўмешваецца чалавек, то ўсё становіцца на свае месцы: «*З тых дзён без спачынку, // Каб кожны быў рад, // Калыша галінка // Усіх птушанят*» [51].

Пісьменнік асуджае эгаізм і абыякавасць, няздольнасць спачуваць чужому гору, падводзіць дзяцей да высновы, што любое зло ў жыцці немінуча будзе пакарана, арыентуе дзяцей на канкрэтныя шляхі выпраўлення сваіх памылак.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе М. Танк напісаў цэлы шэраг твораў на фальклорнай аснове. Аднак народныя сюжэты ён заўсёды творча пераасэнсоўваў, такім чынам атрымліваліся арыгінальныя мастацкія палотны. Напрыклад, казка «Іван-ды-Мар'я» нагадвае легенду пра з'яўленне кветкі з жоўтымі і сінімі пялёсткамі, якую ў народзе нярэдка называюць «браткамі». У народнай трактоўцы хлопец з дзяўчынай толькі пасля жаніцьбы даведваюцца, што яны брат і сястра, таму ідуць у поле і ад вялікага смутку ператвараюцца ў кветкі. У казцы М. Танка «Іван-ды-Мар'я» фальклорная фабульная аснова ледзьве заўважная. Юныя Іван і Мар'я былі паланёны крыжакамі і пагнаны да прускіх замкаў. Аднак, «*чым жыць і гінуць век у кайданах, // Лепш вольным пасці...*» [50], – вырашаюць яны. Пасля трох дзён пагоні варожыя стрэлы дагналі хлопца з дзяўчынай; дзе пралілася іх кроў, там выраслі кветкі з назваю Іван-ды-Мар'я: «*Дагналі стрэлы, ды не дагнала // Іх смерць-няволя, – // Дзе кроў іх пала, закрасавала // Там кветка ў полі*» [50].

Такім чынам, у адрозненне ад фальклорнага твора ў казцы М. Танка адсутнічае сцвярджэнне фатальнай наканаванасці лёсу, асноўная ўвага акцэнтуецца на паэтыза-

цыі свабодалюбства беларусаў, спрадвечнага непрыняцця імі ўціску. Відавочна, што аўтар праводзіць гістарычныя паралелі: параўноўвае часы крыжацкіх набегаў на Беларусь з нашэсцем фашысцкіх захопнікаў. Гэта дазволіла вырашыць канфлікт не ў прыватным плане, а ў нацыянальным маштабе.

Творчае выкарыстанне набыткаў беларускага казачнага эпасу адчуваецца і ў такіх творах М. Танка, як «Журавель і чапля» (1945), «Жук і слімак» (1980). Гэтыя казкі — не спрошчана-прымітыўны пераказ вершамі фальклорных твораў, а з'ява арыгінальная, высокамастацкая. Літаратурныя казкі М. Танка напісаны на высокім прафесійным узроўні; будовай сюжэта, вобразнасцю, эмацыйнай настраёвасцю яны блізкія да народных. Дасціпна, з гумарам у казцы «Журавель і чапля» паэт звяртаецца да вядомага сюжэта фальклорнага твора. Адметнасць гэтай казкі выяўляецца ва ўменні мастака актывізаваць творчае мысленне юных чытачоў, наблізіць паказанае ў творы да іх жыццёвага вопыту. Дзеці часта, як тыя журавель і чапля, не могуць саступіць адзін аднаму, часам прыніжаюць іншых і ўзвялічваюць сябе, таму апраўданым з'яўляецца аўтарскі акцэнт на выхаванне ў дзяцей станоўчага маральнага імператыва, пачуццяў сяброўства і справядлівасці, якія з'яўляюцца неабходнай умовай гармонічнага суіснавання чалавечай супольнасці.

Казка «Жук і слімак», як і кожная казка, мае дыдактычную скіраванасць. Умоўна-казачная форма цесна спалучана ў гэтым творы з рэалістычна-праўдзівым адлюстраваннем рэчаіснасці. Аўтар, звяртаючы ўвагу на няўдзячнасць жука («*Забыўся пра нягоды, // І не на ўме жуку, // Што абяцаў паднесці // Ён хату слімаку*» [56]), засцерагае і сваіх чытачоў ад падобнай рысы характару.

Паказ рэальнага канфлікту канцэнтруе ўвагу на станоўчым жыццёвым вопыце чалавецтва, для якога характэрны ўзаемадапамога, удзячнасць, падтрымка і выручка ў складаных сітуацыях.

Талент М. Танка як дасканалага майстра літаратурнай апрацоўкі выявіўся і ў яго творы «Конь і леў» (1953). Вядома, што дзецям падабаюцца казкі пра жывёл, яны любяць, каб у творах былі дыялогі, элементы сцэнічнасці. Перапрацаваўшы фальклорны сюжэт, пісьменнік, па сутнасці, стварыў невялічкую п'есу паводле зместу беларус-

кай народнай казкі «Як конь стаў старэйшым ад льва». Твор М. Танка напоўнены не толькі ўдалай рыфмай, але і ўнутранай змястоўнасцю, ідэйна і эмацыйна насычаны. Самае ж галоўнае, што вылучае аўтарскую казку, – гэта згушчана-вобразнае мысленне. Мастак сцвярджае на прыкладзе такіх дужых жывёл, як воўк, леў і конь, што любая грубая сіла можа быць пераможана дасціпным розумам і кемлівасцю.

М. Танк тонка адчуваў спецыфіку твораў для дзяцей – у іх ён удала спалучаў прастату і непасрэднасць з маральным максімалізмам. Таму ў адрозненне ад народнай казкі «Як конь стаў старэйшым ад льва» ў творы «Конь і леў» аўтарская ідэя падпарадкавана жыццёвай ісціне, паводле якой дабро заўсёды ўзнагароджваецца: гаспадар хоць і выгнаў каня, але потым зноў вярнуў яго дадому: *«Ён буланага вярнуў // Зноў у стайню – ў дом // І ўвесь век яго карміў // Сенам ды аўсом»* [65].

Такое вырашэнне канфлікту вельмі падабаецца дзецям, бо жывуць яны найперш па законах справядлівасці. Казка «Конь і леў» вылучаецца і лагодным гумарам, што таксама прываблівае маленькіх чытачоў.

Казку «Ля вогнішч начлежных» (1952) М. Танка можна лічыць найлепшым яго дзіцячым творам з гістарычным зместам. У ёй аўтар выступае палымяным абаронцам духоўных скарбаў грамадства. Пісьменнік вырашае адвечна-традыцыйную праблему: ці можна за грошы купіць сапраўднае каханне і быць шчаслівым? Падобны сюжэт характэрны для многіх фальклорных, а таксама літаратурных твораў беларускіх пісьменнікаў. У казцы М. Танка назіраецца творчая пераемнасць традыцый Я. Купалы. Праблемна-тэматычныя паралелі можна правесці паміж казкай «Ля вогнішч начлежных» і паэмамі Я. Купалы «Бандароўна» і «Магіла льва». У абодвух пісьменнікаў атрымаліся выразныя, каларытныя вобразы, якія з'яўляюцца важным сродкам спасціжэння духоўнай сутнасці беларусаў.

Вобразамі Галіны і Васілька аўтар казкі «Ля вогнішч начлежных» паэтызуе высакароднасць і духоўную прыгажосць беларусаў. Паэт ідэалізуе галоўную гераіню Галіну, якая ні за якія матэрыяльныя выгоды не здраджвае самаму светламу пачуццю – каханню: *«Я вольнаю*

*птушкаю // Вырасла тут. // Жыве тут мой суджаны-мілы. // І нас не разлучаць // Ні годы пакут, // Ні гнеў твой, // Ні грозная сіла»* [39–40].

Гэтая казка трагічная па сваёй сутнасці: у барацьбе за сваё шчасце героі ідуць на смерць, каб не быць маральна зняважанымі. Магнат Барыта тут выступае ўвасабленнем усяго ганебнага, варожага, што перашкаджала ў часы прыгнёту жыць людзям сумленным жыццём. Нескаронасць, уменне абараніць сваю годнасць – якасці, уласцівыя Васільку, – заўсёды дапамагалі беларусам выстаяць у часы нягод, таму легендавы аповед увекавечыў памяць аб смелых і адважных юнаках. Хлопец загінуў, а дзяўчына стала крылатаю чайкай, якая лётае над Нарачанскімі азёрамі, што ўтварыліся з асколкаў люстэрка: *«І раптам на месцы, // Дзе высіўся бор, // Дзе срэбныя палі асколкі, – // Ўсё знікла, // Адны толькі хвалі азёр // Заззялі люстэркам, вясёлкай. // Дзяўчына ж крылатаю // Чайкай з тых год // І ў цёплыя ранкі, і ў сцюжу // Над люстрам азёраў, // Прасторамі вод, // Шукаючы мілага, кружыць»* [46].

Казка вучыць чытачоў быць шчырымі ў сваіх пачуццях і заўсёды захоўваць духоўную чысціню. Выхаваўчы патэнцыял гэтага і іншых твораў М. Танка грунтуецца найперш на высокай духоўнасці беларускага народа. Таму часта ў яго творах для дзяцей цэнтральны герой – вольналюбівы чалавек, патрыёт, які нават у самых складаных сітуацыях застаецца адданым сваім маральным прынцыпам.

У казках М. Танка «Сярод лясоў наднёманскіх» (1950) і «Калі вясна прыйшла» (1953) адлюстраваны адухоўлены, дзівосны і запамінальны свет роднай прыроды, пад уздзеяннем якога ў дзяцей фарміруецца пачуццё прыгожага. Удалае выкарыстанне вялікіх магчымасцей беларускай мовы робіць малюнкі прыроды яркімі і каларытнымі. Гераіня казкі «Сярод лясоў наднёманскіх» – дачушка лесніка, Верачка – вырасла на ўлонні маляўнічай прыроды. Тут усё ёй дарагое: кожнае дрэўца, кожная кветка і травінка. Аднак засумавала аднойчы маленькая дзяўчынка, затрывожылася, што ўвосень знікаюць многія прывабныя абрысы прыроднага наваколля: *«Шкада ёй ападаючых // Лістоў і матылькоў, // Шкада ёй адлятаючых // У вырай жураўлёў»* [57].

Як ні раіліся звяры і птушкі, але дапамагчы гору Верачкі не змаглі. Толькі маленькі павучок здолеў ажывіць павуціннем прыроду. У выніку адбываецца як бы духоўнае перараджэнне лірычнай гераіні, якая знаходзіць унутранае апірышча ў спасціжэнні гармоніі навакольнага свету, няўлоўных таямніц прыроды, што нярэдка жыве з чалавекам у адным эмацыйным сугуччы: «*Калі ж прачнулася зара // І ветрык прыляцеў, – // Лес залатымі струнамі, // Ажыўшы, зазвінеў //\ На звон устала Верачка, // Сцяжынаю лясной // Ідзе яна і дзівіцца, // Што лес спявае з ёй*» [59].

М. Танк у гэтым творы выступіў таленавітым паэтычным мастаком-жывапісцам, які паказаў, што беларуская зямля прыгожая, дзівосна маляўнічая і шматфарбная.

У казцы «Калі вясна прыйшла» таксама сцвярджаецца ідэя гармоніі паміж чалавекам і прыродай, адлюстроўваецца разнастайнасць форм і вобразаў прыроднага наваколля. У цэнтры ўвагі паэта абнаўленне прыроднага ўлоння, змена фарбаў на працягу года. З дасціпным гумарам апісваецца ў творы спрэчка птушак, якія прыляцелі з выраю і шукалі вінаватага ў прыродных зменах. Восенню прырода здзіўляла сваёй шматколернасцю, багаццем збожжа і ягад, а за зіму ўсё гэта хараство знікла. Давялося б ва ўсім быць вінаватымі вераб'ям, але дзеці змаглі растлумачыць, што ж адбылося на самай справе: «<...> *зялёны ліст дуброў // Сам асыпаўся далоў. // Збожжа з поля звезлі людзі, // Ягады змарозіў студзень // Подыхам сваім*» [72].

З любоўю і замілаваннем М. Танк апісвае беларускі край. Кожны яго твор пра прыроду – гэта хвалюючы гімн Радзіме, яе непаўторнаму хараству.

Казка «Быліна пра Мураша Бадзіню» з'явілася водгукам на рэальныя падзеі, што адбываліся ў краіне і былі звязаны з актыўным асваеннем космасу. Дзеянне тут разгортваецца не ў нейкім дзівосным казачным царстве, а ў рэальных умовах сучаснасці, і тым не менш твор прываблівае чытача незвычайнай загадкавай магічнасцю. Адухаўляючы герояў, паэт адкрывае незвычайнае ў штодзённым і побытавым. Здавалася б, што незвычайнага ў такіх фактах: дзеці, збіраючы грыбы, згубілі газету. Але паэт далей стварае такія калізіі, якія трымаюць у напру-

жанні ўвагу юных чытачоў з першай да апошняй старонкі твора. Пазбягаючы прамой павучальнасці, аўтар паказвае, як важна быць адукаваным чалавекам: лясныя жыхары не адразу змаглі прачытаць газету, і толькі бусел, «*што гнездаваў на школе, // Які, чуваць, кумекаў у грамаце найболей*», змог паведаміць, «*што з Байканура скора // Ў ракеце касманаўты // Адправяцца да зораў*» [82]. Аўтар выказвае пашану да ведаў і заклікае юных чытачоў настойліва авалодваць граматай, бо без яе не абысціся ў жыцці. На прыкладзе Мураша Бадзіні ўслаўляецца смеласць і адвага тых, хто імкнецца пазнаць нязведанае, стаць першым у любой новай справе. Як ні адгаворвалі Мураша ад ідэі паляцець у космас, ён усё роўна выявіў упартасць і настойлівасць у дасягненні вызначанай мэты: трапіў на самалёце ў Байканур, а потым, перадолеўшы страх, сеў на касмічны карабель. У казцы паэтызуецца сіла розуму, які здольны ператварыць бязмежную фантазію ў рэальнасць. Палёт у космас стаў не казачнай неверагоднасцю, а звычайнай справай. Аўтар звяртаецца да чытачоў, каб і яны не баяліся перашкод і імкнуліся ў жыцці да акрэсленых мэт. Героя казкі М. Танка дапусцілі стаць «*пайнапраўным касманаўтам*», і ён з касмічнай вышыні пабачыў Беларусь: «*Даследаваў з усімі // Падзорныя глыбіні, //\ Шырот паўночных ззянне, // Камет агністых грывы, // Дзівосных, серабрыстых // Аблокаў пералівы*» [88].

Мураш Бадзіня стаў героем, але не заганарыўся і вельмі сціпла перажыў сваю славу. Такім чынам, удалае спалучэнне казачна-фантастычнага з рэальным нарадзіла твор, які мае вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

Адметнасцю многіх казак М. Танка з'яўляецца тое, што мастак удала падпарадкоўвае здабыткі народнай творчасці ідэйна-эстэтычным задачам сучаснасці. Творы паэта з'яўляюцца ўзорам жыццёвай мудрасці, народнай маралі і этыкі. У казках гэтага мастака слова выяўляецца своеасаблівая сістэма педагагічных поглядаў, якая можа дапамагчы юнаму пакаленню знайсці адказы на пытанні пра дабро і зло, пра сяброўства і здраду, пра высакароднае і нікчэмнае.

М. Танк – аўтар шматлікіх дзіцячых вершаў, якія вызначаюцца майстэрствам пабудовы сюжэта, апрацоўкі

фальклорнага матэрыялу, сваёй практычнай педагагічнай скіраванасцю. Напрыклад, традыцыя народных калыханак пра Бая пакладзена ў фабульную аснову дакучлівай байкі-гульні «Ехаў казачнік Бай». Аўтар выкарыстоўвае займальную дыялогавую форму: у дзіцяці пытаюцца, ці баіць, ці не да таго часу, пакуль яно не засне: «*– Ехаў казачнік Бай // Цераз сёлы і гай. // Баіць ці не? // – Бай!*» [96].

Змест, інтанацыйны малюнак гэтай гульні-пацешкі простыя і запамінальныя, бо адрасаваны твор самым маленькім слухачам.

Ёсць у М. Танка калыханка з аднайменнай назвай. Яна напісана ў займальнай форме. Малому Васільку калыханку спяваюць не маці, не бабуля, а, што асабліва цікава дзецям, сарока-белабока і кума-варона. Тут адбываецца няўлоўна тонкае судакрананне душы лірычнага героя з таямніцамі прыроднага ўлоння, з яго загадкава-магічнай сілай душэўнага ўздзеяння: хлопчык спасцігае сутнасную красу акаляючай рэчаіснасці і першароднае хараство наваколля, здзіўляецца, захапляецца жыццём. Дзіця не засынае, бо ўсё яму цікава: «*То яго звадзіла рэха, // То спаць зоры не давалі, // То яго паліла сонца, // То завеі асыпалі* <...>» [104].

У вершы «Песня» аўтарам удала перададзена спеўнасць, меладычнасць беларускай калыханкі. Зрокава-асацыятыўны малюнак верша вытрыманы ў мяккіх, пластычных метафарычных танах, у выніку чаго ствараецца эмацыйны настрой сцішанасці, лагоднасці, дрымоты, якому схільная паддавацца ў моманты душэўнага ўзрушэння і сама лірычная гераіня пад час закалыхвання дачушкі.

Верш «Перад сном» па сэнсава-інтанацыйнай і рытмічнай напоўненасці блізкі да беларускай народнай калыханкі. Твор нагадвае песню маці каля калыскі свайго дзіцяці: «*Позна. // Над нівамі змрок. // Спі, мой маленькі сынок!*» [124]. Аўтар у творы выкарыстоўвае і цэлы шэраг традыцыйных для беларускіх калыханак вобразаў – ката, курачкі, дрымоты: «*Чуеш: мінула ўжо слота, // На цыпках ідзе каля плота // На дрэвы, на травы – ціхота, // На курак-чубатак – маркота, // На цвыркуна – лянота, // А на ката – мармота, // А на дзяцей – дрымота...*» [124].

Выкарыстанне памяншальна-ласкальных суфіксаў і сэнсавы ланцуг «*ціхота – маркота – лянота – мармота – дрымота*» ўздзейнічаюць на ўяўленні і падсвядомасць слухачоў праз рытмічна-гукавыя і вобразныя асацыяцыі, спрыяюць стварэнню адпаведнага настрою дрымоты.

Для многіх вершаў М. Танка характэрны жарт і дасціпная ўсмешка. Гумарыстычныя паводле зместу творы «Пудзіла», «Паўказка», «Заячы дом», «Бусел», «Сняжынкі». Напрыклад, у вершы «Заячы дом» насуперак фальклорнай традыцыі (казка «Зайкава хатка») галоўны герой заяц паказаны гультаём, які похапкам, неахайна пабудаваў сваю хату: «*Пад ракітавым кустом // Заяц збудаваў свой дом. // Ну і майстра, ну і дом – // Вецер ходзіць там кругом*» [76].

З мяккім гумарам напісаны вершы «Сава» і «Над чым думае варона?». У іх аўтар жартуе з савы, якая не ведала, што такое рэха, і з вароны, якая не бачыла розніцы паміж дажджом і фантанам. Вобразы савы і вароны тут алегарычныя, яны ўвасабляюць дзіцячую наіўнасць і жаданне знайсці адказы на ўсе пытанні.

Для вершаў М. Танка ўласціва іранічная ўсмешка ўмудронага вопытам чалавека, які многае перажыў і не страціў пачуцця здзіўлення дзіцячай непасрэднасцю. Паэт умее шчырым і душэўным словам выклікаць давер юнага чытача. Для яго творчай манеры характэрна жаданне зразумець асаблівасці дзіцячага свету. Веданне псіхалогіі дзяцей і шматгадовыя назіранні М. Танка за імі спрыялі нараджэнню цікавых вершаў. У творы «Кормяць Сярожку» перадаецца пашыраная побытавая сітуацыя, калі бацькі з дапамогай хітрыкаў хочуць накарміць маленькіх дзяцей. Аўтар паказвае, як гэтую «гульню» зрабіць больш цікавай і нават узвышана-паэтычнай, калі прапанаваць дзецям есці за маміну казку, за татавы гушканні-гулі, за жаўрука над хатаю, за сонца-сонейка. Тым самым мастак акцэнтуе ўвагу на выхаванні любові і ўдзячнасці блізкім людзям, прывівае дзецям адчуванне еднасці з прыродай.

Высокай творчай культурай, псіхалагізацыяй мастацкага вобраза, гранічна вытанчанай прачуласцю сэнсавай дэталі, майстэрствам перадачы «дарослай» ідэі ў даходліва-забаўляльнай форме вызначаецца паэтызацыя М. Танкам навакольнага свету ў вершах «Паклон хлебу»,

«Чаму птушкі лётаюць», «Свет», «Красуня», «Сакавік», «Бабка» і інш. У цэнтры гэтых твораў – прывабны вобраз маладога чалавека: уражлівага, чулага, здольнага бачыць прыгажосць наваколля і чалавека, адчуваць гармонію суіснавання жывой і нежывой прыроды.

У вершы «Ірынка» маленькая гераіня вельмі ўпадабала вясну і не хацела, каб восенню дрэвы гублялі лістоту, а птушкі адляталі ў вырай. Аўтар паказвае дзіцячую наіўнасць і непасрэднасць, якія не могуць не выклікаць шчырай усмешкі і замілавання. Ірынка прасіла прыроду пакінуць прыгажосць фарбаў і дамаглася свайго: «*Прасіла яна шчыра так, // Прасіла ўсю зіму, // І мо вясна аж з выраю // Вярнулася таму*» [54].

Глыбокае адчувальна-рэчыўнае ўспрыманне акаляючай рэчаіснасці ўласціва і лірычнай гераіні верша «Поўдзень мая». Эмацыйна-настраёвая канва твора будуецца на паэтызацыі гармоніі знешняй і ўнутранай красы дзяўчыны Ганулькі, здольнай трымаць у сваім сэрцы «*поўдзень мая*», адорваць іншых жартамі, усмешкамі і песнямі.

Лірычная гераіня верша «Красуня» ходзіць босай (мама яшчэ не купіла чаравічкаў), а твар яе курносы і вяснушкаваты, аднак дзяўчынка нечакана робіць адкрыццё сябе ў сабе. Са здзіўленнем яна заўважае знешнюю непаўторнасць, асабістую прывабнасць, параўноўвае ўласнае аблічча з «*бутонам чырвонай ружы*». Дадзеная метафара надзвычай ёмістая і трапная, бо краска ружа, як і юная гераіня, да часу свайго росквіту непрыкметная, не кожны зверне на яе ўвагу.

Шчырая і даверлівая размова аўтара і чытача аб вядомым і невядомым пашырае кругагляд маленькіх чытачоў, а таксама выхоўвае іх, вучыць быць больш уважлівымі і назіральнымі. Ёсць у М. Танка некалькі вершаў з назвай-пытаннем: «Чаму ў нас раней усходзіць сонца?», «Чаму птушкі лётаюць?», «Чаму настаў вечар?», «Як збіраць кветкі?», «Хто самы старэйшы?» і інш. У гэтых творах паэт з гумарам тлумачыць цікавыя з'явы навакольнага свету, жыцця ў цэлым.

Многія вершы М. Танка, назвы якіх маюць пытальныя формы, даюць дзецям магчымасць уключацца ў актыўную інтэлектуальна-разумовую дзейнасць, далучацца да інтэнсіўнага пошуку адказаў на аўтарскае пытанне.

У падобным ключы напісаны, напрыклад, верш «Задача для ўнукаў». У ім мастак слова стварае цікавы асацыятыўны ланцужок «*дрэва* (*год*) – *сук* (*месяц*) – *галінка* (*тыдзень*) – *лісток* (*дзень*)». Зварот да гэтага верша-загадкі можа быць карысным не толькі на ўроках чытання, але і матэматыкі.

У вершы «Лемантар» аўтар паэтычна ўзнаўляе беларускі алфавіт, на кожную літару прыводзіць прыклады адпаведных слоў, якія ярка характарызуюць рэаліі роднага краю: «*А – Айчына. Арабіна. // Б – Бабёр. Буслянка. Брод. // В – Вавёрка. Верабейка. // Г – Гумнішча. Гарызонт*» [4].

Паэт аднак не проста знаёміць дзяцей з беларускім лемантаром, а нагадвае яго старажытную гісторыю ад кніг «*Скарыны-бацькі*», заклікае юнага чытача «*быць сумленным, смелым, супраць злыбедаў ісці*». Аўтар вядзе нязмушаную гутарку з чытачамі, выкарыстоўвае лагоднапяшчотную інтанацыю, стварае даверлівы настрой, у выніку чаго ўзмацняецца адукацыйна-выхаваўчы эфект тэксту: «*Разгарні яго з любоўю... // Літар стройныя рады // Прачытай, і паўтары іх, // І запомні назаўжды*» [4].

Вершы М. Танка для дзяцей здзіўляюць ідэйна-мастацкім багаццем, разнастайнасцю тэм, вобразаў, мастацкіх форм, уменнем даходліва падаць юным чытачам усю складанасць чалавечага быцця. Вызначальнымі рысамі паэзіі для дзяцей гэтага мастака слова сталі творчае выкарыстанне фальклорных традыцый, багацце вобразна-выяўленчых сродкаў, разнастайнасць рытміка-інтанацыйных форм. Усё гэта спрыяе развіццю ў дзяцей вобразнага мыслення.

Памёр М. Танк 7 жніўня 1995 г. Апошнім прыстанішчам сапраўды народнага паэта стала родная вёска Пількаўшчына. У 1997 г. (ужо пасля смерці паэта) у выдавецтве «Юнацтва» была выдадзена кніга «Блікі сонца», якую склалі лепшыя вершы і казкі, напісаныя мастаком для дзяцей. Гэтую кнігу па праву можна ўключыць у залаты фонд беларускай дзіцячай літаратуры.

балізацыі. Тут гіпербалізуецца ўсё: ад персанажаў да пачуццяў. Напрыклад, у першай дзеі («Люстраная шафа») Пацук з'ядае вячэру, якая прызначана для дзяцей, Таты і Мамы, потым усё, што ёсць у доме, піражныя, нават цэглу, расфарбаваную пад торт, збіраецца з'есці бочку капусты. У апошняй дзеі («Чорная Рука») адбываецца гіпербалізацыя пачуцця жаху, звязанага са з'яўленнем Чорнай Рукі, якая хапае ўсіх і цягне невядома куды. Урэшце недарэчнасць сітуацыі заключаецца ў тым, што ў фінале кожнай дзеі гіпербалічнае развенчваецца: Пацука закацілі ў бочцы, Чорная Рука, якая наводзіла на ўсіх жах, аказалася ўсяго толькі згубленай пальчаткай Таты. Такім чынам, па-першае, мадэлюецца абсурднасць пачуцця страху, а па-другое, парадыруецца сучасная рэцэпцыйная запатрабаванасць у трылеры, імкненне атрымаць вострыя пачуцці.

Важным элементам сучаснай драматургіі для дзяцей і юнацтва з'яўляецца выкарыстанне ў ёй элементаў фэнтэзі і навуковай фантастыкі. Менавіта ў гэтай стылістыцы вытрыманы п'есы «Канікулы на астэроідзе» (1994) *З. Дудзюк* і «Рамантычнае падарожжа на той свет» (1994) *Г. Багданавай*. У апошнім творы падымаецца актуальная праблема для нашага грамадства — праблема падлеткавага самазабойства. Галоўныя героі — Арцём і Анжэла — выйграваюць у гульні «Каханне з першага погляду» рамантычнае падарожжа ў Венецыю, але адпраўляюцца на той свет. У дадзеным выпадку сумяшчэнне ў часе двух светаў (жывых і нябожчыкаў), а таксама перамяшчэнне персанажаў у прасторы і часе пры дапамозе нявытлумачаных дзеянняў, стварэнне сітуацыі гульні, мадэляванне памежнай сітуацыі і іншае дае падставы сцвярджаць, што п'еса Г. Багданавай адносіцца да плыні фэнтэзі. Усё, што адбываецца з галоўнымі героямі, вельмі нагадвае сон. Рэальнасць тут успрымаецца як вобраз, які адлюстроўваецца ў люстэрку, — «сон наяве». Нерэальнасць дапамагае спасцігнуць сапраўднае. Г. Багданава вылучае жыццёвыя прыярытэты, узвышаючы сваіх герояў у іх неўсвядомленых жаданнях. І тым самым героі набліжаюцца да рамантычных асоб, якія здольныя да самаахвяравання і ачышчэння праз пакуты. Так, грэх Арцёма, што падштурхнуў Бэлу да самазабойства і тым самым забойства свайго дзіцяці, і грэх Анжэлы, якая сваім раўнадушшам загубіла

Бранюся, патрабуюць пакут. Смерць – гэта той штуршок, які вядзе праз пакуты да ачышчэння ад «няшчасця». Неабходна адзначыць, што пісьменніца з традыцыйнай для беларускай літаратуры гуманістычнай заглыбленасцю імкнецца давесці дзецям, што самазабойства не прыносіць карысці нікому, а нясе толькі пакуты, як мёртвым, так і жывым.

Своеасаблівым запаветам усім драматургам і мастакам XXI ст., якія пішуць для дзяцей і дарослых, з'яўляюцца словы самазабойцы Бронюся: *«Дзякуй Богу, што дваццаць першае стагоддзе абяцае быць гуманітарным, як і дзевятнаццатае. Можа, дасць Бог, крыві меней пральецца, чым у бяздушным дваццатым»*[1].

## Тэма 8.2. ПАВЕЛ МІСЬКО (Павел Андрэевіч Місько) (1931)

**Павел Андрэевіч Місько** – таленавіты пісьменнік, які паўнагучна акрэсліў перспектыўныя параметры развіцця сучаснай нацыянальнай дзіцячай літаратуры. Асабліва вядомымі і папулярнымі ў падрастаючага пакалення сталі такія разнастайныя ў жанрава-стылёвым і ідэйна-тэматычным плане яго творы, як «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц ў жыцці Жэні Мурашкі» (1972), «Прыгоды Бульбобаў» (1977), «Грот Афаліны» (1985), «Эрпіды на планеце Зямля» (1987), «Прыйдзі дзень-залацень» (1993). Творы П. Місько народжаны сапраўднай любоў'ю да дзяцей, неабыякавасцю да іх праблем і клопатаў, верай у непераможную сілу дабрыні, сяброўства, узаемадапамогі.

У юныя гады будучаму пісьменніку давялося перажыць шмат цяжкасцей і нягод, якія загартавалі яго і прадвызначылі далейшыя жыццёвыя пуцявіны. Павел Місько нарадзіўся 14 сакавіка на Случчыне ў вёсцы Старцавічы (зараз Знамя). Нялёгкай была доля сям'і Місько ў складаныя 1930-я гг., калі згарэла хата, але яшчэ большыя выпрабаванні выпалі пазней: у гады фашысцкай навалы і пасляваеннай галечы.

---

[1] *Багданава, Г.* Рамантычнае падарожжа на той свет / Г. Багданава // Тэатральная Беларусь. 1994. № 6. С. 17.

Вялікі ўплыў на станаўленне характару будучага пісьменніка аказала сям'я, асабліва маці і дзед па матчынай радні. На ўсё жыццё запомнілася пісьменніку, як вечарамі маці, калі прала ці вязала, расказвала цікавыя казачныя гісторыі. Яна цудоўна ведала фальклор: не толькі расказвала казкі, але і прыгожа спявала. Таму з самага дзяцінства П. Місько быў далучаны да цудоўнай скарбніцы беларускай вуснай народнай творчасці, што абуджала цікавасць і да мастацкай літаратуры. Другім фактарам развіцця творчых здольнасцей будучага пісьменніка стала далучэнне яго да таямніц прыроднага наваколля. Дзед Лукаш адкрыў унуку цудоўны свет прыроды. Лукаш Нядзелька часта браў унука ў свае лясныя вандроўкі, падчас якіх вяліся цікавыя і незабыўныя гутаркі. Пазней пісьменнік не раз з цеплынёй і павагай успамінаў свайго дзеда. «*І якіх бы старых я потым не выводзіў у сваіх творах (Стахей у аповесці "Зямля ў нас такая", Парахенька з аповесці "Поезд ішоў на Захад" і інш.), некаторыя рысачкі дзеда Лукаша я перадаваў ім*»[1], – засведчыць пісьменнік у аўтабіяграфічным эсэ «На покліч душы».

Яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны П. Місько скончыў два класы Старцавіцкай школы з пахвальнай граматай, таму пасля вызвалення вёскі ад фашыстаў як здольны вучань пайшоў адразу ў пяты клас. Затым ён працягваў вучобу ў Слуцкай СШ № 10 (1947–1950 гг.), а летам дапамагаў бацькам па гаспадарцы. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці ў сям'і, бацькі падтрымлівалі жаданне хлопца вучыцца.

У юныя гады не хапала дзіцячых кніг, таму вялікай радасцю была для будучага пісьменніка кожная новая кніга. Самае ж вялікае ўражанне на будучага мастака слова аказала творчасць Я. Маўра, традыцыі якога адчуваюцца ў многіх творах П. Місько. Пасля заканчэння сярэдняй школы будучы пісьменнік паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Там ён пазнаёміўся і пасябраваў з Н. Гілевічам, А. Вярцінскім, У. Нядзведскім і іншымі пачынаючымі мастакамі слова. Творчая атмасфера на факультэце натхняла П. Місько на літаратурную творчасць. Малады аўтар прымаў удзел у вы-

---

[1] *Місько, М.* На покліч душы / М. Місько // Маладосць. 1983. № 3. С. 145.

данні насценнай газеты і рукапіснага альманаху «Творчасць журналіста», друкаваўся ва універсітэцкай шматтыражцы; і ўжо тады яго нарысы пачалі рэгулярна з'яўляцца ў рэспубліканскім друку.

Пасля паспяховага заканчэння вучобы ў 1955 г. П. Місько працаваў на Брэстчыне ў давыд-гарадоцкай раённай газеце «Сцяг Леніна». Па сутнасці, з Палесся пачалася яго вялікая дарога ў літаратуру. Пасля пісьменнік працаваў у газетах «Звязда» і «Сельская газета», быў на адказных пасадах у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя», выдавецтве «Мастацкая літаратура». Публіцыстычную дзейнасць сумяшчаў з мастацкай творчасцю: пісаў пра вайну, сучаснае жыццё, пра цудоўны свет дзяцінства. Самыя вядомыя яго кнігі – раманы «Мора Герадота» (1976), «Градабой» (1980), «Хлопцы, чые вы будзеце...» (1990), аповесць «Ціхае лета». Нягледзячы на значныя поспехі ў творчасці для дарослых, асноўным літаратурным прызваннем П. Місько стала дзіцячая літаратура. У творах, разлічаных на дзіцячую аўдыторыю, пісьменнік выступае добрым знаўцам дзіцячай псіхалогіі, сапраўдным педагогам, які клапоціцца пра маральнае здароў'е юнага пакалення. Яго творы пра дзяцей уражваюць жыццёвай праўдай, натуральнасцю і пераканальнасцю ўзаемаадносін паміж юнымі героямі – у гэтым выяўляецца багаты жыццёвы вопыт і добры эстэтычны густ пісьменніка. Лейтматывам усёй творчасці П. Місько сталі словы Піфагора, выкарыстаныя ў якасці эпіграфа да апавядання «Поезд ішоў на Захад»: «*Беражыце слёзы вашых дзяцей, каб яны маглі праліваць іх на вашай магіле*»[1].

Першым творам П. Місько, напісаным для юнага чытача, стала дакументальная аповесць «Падарожжа ў калгас» (1970). У ёй расказваецца пра жыццё юнакоў у камсамольскім лагеры працы і адпачынку «Юнацтва», які дзейнічаў на Брэстчыне, у Камянецкім раёне, пад апекай знакамітага старшыні калгаса «Савецкая Беларусь» Уладзіміра Лявонцьевіча Бядулі (пазней двойчы Героя Сацыялістычнай Працы). Аўтар вядзе аповед ад імя непасрэднай удзельніцы тых падзей Святланы Мельнікавай, якая прыехала ў Беларусь з далёкай Караганды да

---

[1] *Місько, П.* Між мінулым і будучым / П. Місько. Мінск, 1986. С. 129.

сваякоў. Галоўная гераіня ў пісьмах да сваіх сяброў расказвае пра незабыўныя працоўныя будні і святы, якія перапоўнены радасцю адкрыцця новага і дагэтуль невядомага для шаснаццацігадовай дзяўчыны. У творы паказваецца, як хлопцы і дзяўчаты пачынаюць усведамляць сілу калектыву і кошт сялянскай працы; акцэнтуецца ўвага і на патрыятычным выхаванні юнага пакалення: многія старонкі аповесці прысвечаны ўспамінам пра трагічнае і гераічнае ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аповесць спрыяе фарміраванню светапоглядных арыенціраў у юных чытачоў і станаўленню іх характару.

У 1967 г. выйшла першая кніга апавяданняў П. Місько «Калодзеж». У творах гэтага зборніка аўтар без празмернага дыдактызму, з дасціпным гумарам раскрыў шматлікія эстэтычна-выхаваўчыя і педагагічныя задачы («Як дзеда дзялілі», «Смажаны лёд, або апавяданне пра Несусветнага Хлуса», «Чараўнік Косця», «Як Саша ў космас лятаў» і інш.). Пераважная большасць гэтых апавяданняў адрасавана дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Дзеці часта становяцца ахвярамі несправядлівасці, маральнай абразы і з боку дарослых, і з боку сваіх сяброўаднагодкаў. Так, у апавяданні «Каляндар сумлення» праз узаемаадносіны двух хлапчукоў Толі Васільева і Сцёпы Мармышкі, якія атрымалі ад настаўніцы адказнае даручэнне намаляваць для свайго класа каляндар надвор'я, раскрываюцца праблемы сумлення, годнасці, сяброўства, узаемападтрымкі. Калі Сцёпа не паспеў своечасова зрабіць сваю частку задання, Толя са сваёй бабуляй безадкладна яму дапамог. Наступным жа днём няшчыры яго сябар аўтарства газеты прыпісаў сабе. Фінальная карціна твора перадае ўзрушэнне хлопчыка ад падману, няшчырасці, двурушнасці яго сябра: *«Толя аслупянеў ад такога нахабства Мармышкі. І не знайшоў, што сказаць. У вачах закруціліся слёзы»*[1].

Ахвярамі самаўпэўненасці, ганарлівасці, непаслушэнства сваіх сябрукоў становяцца і маленькія героі такіх апавяданняў маральна-этычнай тэматыкі П. Місько, як «Добры чалавек», «Салодкія яблыкі» і інш. Пры гэтым

---

[1]*Місько, П.А.* Эрпіды на планеце Зямля / П.А. Місько. Мінск, 1987. С. 210.

аўтар кожны раз падкрэслівае, што несумленныя ўчынкі неслухаў-ашуканцаў абавязкова прыводзяць дзяцей да адпаведнага пакарання.

Глыбокім пазнавальным і выхаваўчым патэнцыялам вызначаюцца апавяданні П. Місько, у якіх паэтызуецца прырода роднага краю, праводзіцца ідэя непарыўнай сувязі чалавека і наваколля («Лясныя дарункі», «Восеньскім днём», цыкл «Ласіныя пацеркі» і інш.). У гэтых творах аўтар вучыць дзяцей беражлівым адносінам да прыроднага ўлоння, знаёміць з рэдкімі прадстаўнікамі флоры і фауны, акцэнтуе ўвагу на тым, што прырода дапамагае чалавеку сфарміраваць пачуццё прыгожага. Пісьменніку імпануе тое, што многія дзеці ў параўнанні з дарослымі яшчэ не страцілі адчування глыбокай унутранай паяднанасці з прыродай, далучанасці да патаемнага свету гармоніі, як, напрыклад, герой апавядання «Чараўнік Косця», які інтуітыўна адчуваў мову птушак.

Сапраўдную вядомасць у галіне дзіцячай літаратуры П. Місько пранесла гумарыстычная аповесць «Навасёлы». У творы апісваюцца падзеі аднаго месяца з жыцця хлапчукоў-аднагодкаў Жэні Мурашкі, Жэні Гаркавага, Васі, Сярожы, Паўлушы і яго малодшага брата Геніка, які ходзіць яшчэ ў дзіцячы садок. Галоўны герой Жэня Мурашка разам са сваімі сябрамі амаль штодня трапляе ў недарэчныя сітуацыі, *«вясёлыя, а часам і страшнаватыя гісторыі»*: блуканне ў падвале дома, купляннe ката, абвал выкапанай пячоры, знаходка бомбы ў затоцы Нёмана і інш. Дзеці, як і ўсе ў іх узросце, вясёлыя, гарэзлівыя, дапытлівыя. Ім не заўсёды ўдаецца быць акуратнымі і культурнымі, здзяйсняць свае абяцанні, дакладна выконваць даручэнні старэйшых. «Негатывы» ў паводзінах хлапчукоў не застаюцца не заўважанымі бацькамі, якія жадаюць сваім дзецям толькі дабра. Дарослыя імкнуцца выхаваць старанне і цікавасць да выканання школьных заданняў, клапоцяцца пра здароўе сваіх дзяцей. Гэтыя турботы нярэдка аказваюцца празмернымі, што відаць, напрыклад, з анекдатычнага лекавання мамай-медыкам драпін Жэні Мурашкі. У той жа час бацькам, заклапочаным сваімі справамі, не заўсёды ўдаецца далучыцца да праблем дзяцей, зразумець, што свавольныя гульні маленькіх навасёлаў – адзін са сродкаў пазнання імі складанага навакольнага свету.

Station

Становучы ўплыў на сяброў з другога класа зрабіў іх сусед па двары Лявон Іванавіч. Гэта чалавек сталага ўзросту, высокага духоўнага складу, ён шчыры з людзьмі, да яго разважлівай думкі прыслухоўваюцца дарослыя і дзеці, на агульным сходзе яго выбіраюць кіраваць камітэтам жыльцоў новага дома. Дзеці бачаць у Лявоне Іванавічу добрага сябра і дарадца, арганізатара незвычайных мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні вуліцы і двара. Галоўнае, што ён ставіцца да хлапчукоў як да роўных, давярае ім таямніцу «трох **ні**». Пад уплывам гэтага чалавека дзеці пачынаюць усведамляць сваю адказнасць за таварышаў. Герою-апавядальніку Жэні вельмі прыкра і сорамна, што сябры падвялі Лявона Іванавіча, што іх непаслушэнства амаль не скончылася трагедыяй з Васем. Дзядзька Лявон развівае фізічную вынослівасць дзяцей, даручае ім самім зрабіць тэатр лялек, намаляваць эскізы будучых герояў, зляпіць фігуркі дзіўных чалавечкаў, што павінна было спрыяць фарміраванню ў школьнікаў такіх якасцей, як творчае мысленне, самастойнасць, працавітасць, цярпенне, акуратнасць, беражлівасць.

Пад уплывам Лявона Іванавіча мяняюцца паводзіны, адносіны да таварышаў, дарослых, прыроды і ў Жэні Мурашкі; у яго паступова абуджаецца пачуццё справядлівасці. *«Юны неслух»* пачынае абурацца тым, што малодшыя класы прымушаюць хадзіць у школу ў зменным абутку, у той час калі старэйшыя ігнаруюць гэтае правіла. Ён своеасабліва пратэстуе супраць таго, што далёка не ўсе жыхары новага дома прымаюць удзел у суботніку, негатыўна ставіцца да высакамерных, пагардлівых і абыякавых людзей.

Лявон Іванавіч дапамагае дзецям пазнаваць асноўныя законы жыцця, дае прыклады высакародных адносін да людзей. Ён раіць у складаных сітуацыях не губляць прыстойнасці, прапануе не канфліктаваць з-за драбязы, у прыватнасці не вінаваціць у крадзяжы драўлянай шыльды Дзерваеда.

Паступова ў дзяцей фарміруецца пачуццё адказнасці, яны вучацца кантраляваць свае ўчынкі і паводзіны. Хлопцы-навасёлы нароўні з дарослымі ўдзельнічаюць у добраўпарадкаванні свайго двара, шукаюць з Лявонам Іванавічам саджанцы, уласнаручна садзяць кусты і дрэўцы.

Без празмернага дыдактызму, ненавязліва аўтар паказвае неабходнасць беражлівага стаўлення дзяцей да «агульнай» маёмасці, і ў выніку звычайная рэстаўрацыя сапсаванай трубы ператвараецца ў вясёлыя прыгоды маленькіх навасёлаў, якія знаходзяць у склепе дома «марскога» ката. Фіналам гісторыі Жэні Мурашкі становіцца пастаноўка хлапчукамі лялечнага спектаклю для ўсіх навасёлаў свайго двара, калі дзеці змаглі па-сапраўднаму адчуць сябе артыстамі, пацвердзіць адказнасць за агульную справу.

Аповесць «Навасёлы...» не толькі пра вясёлыя гульні, жарты і прыгоды хлопцаў-сяброў. Гэта твор глыбокай эстэтычна-выхаваўчай і педагагічнай танальнасці. П. Місько паказаў, як бесклапотныя неслухі ў сваёй першароднай душэўнай чысціні, непасрэднасці ўспрымання свету могуць быць незвычайна таленавітымі, старannымі, акуратнымі, сумленнымі дзецьмі.

Кнігі П. Місько прасякнуты імкненнем падарыць дзіцяці радасць сустрэчы з прыродай, жаданнем абудзіць фантазію, даць урокі чалавечнасці. Асабліва ярка ў гэтым рэчышчы выдзяляецца аповесць «Прыгоды Бульбобаў» (1977). Гэтая фантастычная і разам з тым вельмі рэалістычная аповесць стала сапраўдным поспехам П. Місько: яна засведчыла, што ў айчынным мастацтве слова для дзяцей з'явіўся таленавіты пісьменнік-анімаліст. У займальнай форме аўтар расказвае пра маленькіх сабачанят Бульку і Боба, якія толькі нарадзіліся і паступова знаёмяцца з акаляючым асяроддзем. Пісьменнік абраў арыгінальную форму падачы матэрыялу: ён вядзе аповед ад імя Булькі і Боба, ачалавечваючы іх, што робіць твор не толькі займальным, але і вельмі пазнавальным. Надзяляючы сабачанят чалавечымі якасцямі, мастак стварае не ілюзію, а рэалістычны малюнак блізкіх і трапяткіх узаемаадносін чалавека і жывёлы.

З першых старонак твора маленькі чытач трапляе ў незвычайны, у многім яшчэ невядомы, але вельмі прывабны і цікавы свет прыроды. З добрым веданнем справы П. Місько расказвае пра першыя месяцы жыцця сабак: як і што яны ядуць, як мыюцца, як арыентуюцца на мясцовасці, як вучацца адрозніваць пахі. Мастак вучыць юных чытачоў заўважаць, што падабаецца і што непрыемна сабакам.

Аповесць «Прыгоды Бульбобаў» развівае ў дзяцей назіральнасць: аўтар адзначае, што калі паназіраць за хвастом, вушамі, спінаю, пысаю, то можна даведацца пра сабак і іх настрой. Вось як, напрыклад, праз ацэнку сабакі Пальмы аўтар апісвае значэнне формы хваста: «*Калі поўны абаранак, хвост напружаны, то гэта многае можа азначаць. Або ў сабакі цудоўны настрой, або мы ўстрывожаныя, разгневаныя. Калі ж не поўны абаранак рабіць і крыху памахаць хвастом, значыць: "Прывітанне!"*»[1]. З твора дзеці даведаюцца, якую карысць прыносяць сабакі людзям, што ёсць сабакі-пастухі, ездавыя сабакі, сабакі-пагранічнікі, сабакі-сышчыкі і інш. Аўтар нават успамінае пра сабак-касманаўтаў – Белку і Стрэлку. Такім чынам, гэты мастацкі твор задаволіць пазнавальныя інтарэсы самых дапытлівых і патрабавальных чытачоў.

Мастацкая гісторыя Булькі і Боба – гэта цудоўны ўрок дабрыні. Знаёмства чытачоў з гэтай кнігай нясе не толькі радасць і станоўчыя эмоцыі, але і рэалізуе важную педагагічную задачу. Твор «Прыгоды Бульбобаў» спрыяе фарміраванню духоўна гарманічнай асобы, якая будзе любіць бацькоў, паважаць людзей, аберагаць прыроду, клапаціцца пра родны край. Сваю аўтарскую канцэпцыю П. Місько ўвасобіў у творы тактоўна, займальна, з гумарам, без дакучлівага дыдактызму. Асабліва пераканальна на прыкладзе сабак пісьменнік перадае ўсю пяшчоту і цеплыню ва ўзаемаадносінах маці і дзіцяці. З самых першых старонак юны чытач заглыбляецца ў атмасферу цеплыні сямейнага шчасця: *«Ма-а-а-ма-а <...> – Мне зрабілася лёгка і радасна. Дык вось яно хто – тое вялікае, цёплае, добрае! І смачнае, пахучае! Гэта проста мая мама. Мама, мама!»*[2]. Аўтар паказвае, што светаадчуванне шчанят у творы вельмі падобна на ўспрыманне свету маленькімі дзецьмі. Гэта і моцная залежнасць ад маці, і нявопытнасць, і наіўнасць уяўленняў пра свет і людзей.

Адметнасцю твора з'яўляецца шырыня дыяпазону мастацкай інфармацыі пра сабак: пра іх пароды (аўчарка,

---

[1] *Місько, П.* Прыгоды Бульбобаў / П. Місько // Акрабат у бутэльцы. Аповесці. Мінск, 1994. С. 20.
[2] Тамсама. С. 5.

баксёр, фокстэр'ер, пекінэс, японскі хін і інш.), прыкметы пародзістасці, практычнае прызначэнне пэўных відаў. Так падрабязна і даступна расказаць дзецям пра гэтую жывёлу мог толькі чалавек, які не толькі добра ведае сабак, але і любіць іх. Кожны эпізод жыцця Булькі і Боба пацвярджае, што П. Місько імкнецца прывіць чытачам любоў да братоў нашых меншых, спрабуе навучыць спачуванню жывёлам, адносінам да іх з цеплынёй – у гэтым вялікае экалагічнае значэнне твора.

Вялікую цікавасць для юных чытачоў маюць вобразы Колі і Толі. Вобразы братоў намаляваны аўтарам псіхалагічна пераканальна; тут выяўляецца ўменне тонка і шматгранна раскрываць дзіцячы свет. Дзеці з радасцю клапоцяцца пра сваіх сяброў-сабачанят і пазнаюць невядомы для іх свет прыроды.

Асаблівасць творчага таленту П. Місько – гэта тонкае валоданне пачуццём гумару. Шмат эпізодаў твора напісаны як бы з натуры, з назіранняў за паводзінамі дзяцей, таму чытачы неаднойчы пацешацца, пазнаючы ў героях сябе ці сваіх сяброў. Аповесць «Прыгоды Бульбобаў» насычана цікавымі і неверагоднымі падзеямі, а спалучэнне павучальнасці і займальнасці робіць сюжэт твора цікавым і дынамічным.

Працягам аповесці «Прыгоды Бульбобаў» стала аповесць «Як на нашы імяніны». Галоўнымі героямі гэтага твора з'яўляюцца тыя ж самыя браты Коля і Толя. Гэтае мастацкае палатно вызначаецца ўменнем аўтара з любоў'ю і шчырай усмешкай гутарыць з дзецьмі пра клопаты і праблемы, якія хвалююць кожнага юнага чытача. Тут гаворка і пра ўзаемаадносіны дзяцей, і пра ўзаемаадносіны дзяцей і дарослых, і пра стасункі дзяцей з прыродай, і шмат яшчэ пра ўсё тое, што так цікава пазнаваць малодшым школьнікам. У аповесці «Як на нашы імяніны», як і ва ўсіх творах П. Місько для дзяцей, выявілася педагагічная чуйнасць аўтара, які ўмее правільна ацаніць учынкі дзяцей, паказаць, што жыццё ў гэтым узросце такое ж цікавае і паўнацэннае, як і жыццё дарослага чалавека.

У творах П. Місько для дзяцей заўсёды ёсць мастацкая праўда, бо гэты пісьменнік умее спалучыць шматгадовыя назіранні за жыццём падрастаючага пакалення з цудоўным уменнем апісаць усё цікава і займальна. Ужо ў назве аповесці ёсць элемент інтрыгі, які распальвае ціка-

васць чытача. Пачатак твора настройвае на вельмі даверлівую гутарку чытачоў з аўтарам, які добра ведае клопаты і праблемы адрасата, яго імкненне да новага, невядомага, загадкавага: «*Ці было калі-небудзь з вамі такое? Захочацца чагосьці моцна-моцна, аж не вытерпець, а яно і збываецца. Як у казцы! Ды не проста збываецца, а наробіцца ўсяго ў сто разоў больш за самыя смелыя пажаданні*»[1].

Аповесць «Эрпіды на планеце Зямля» (1987) стала значным поспехам літаратуры для юнага чытача. Сакрэтам поспеху П. Місько з'явілася ўдалае спалучэнне фантастычнай формы адлюстравання рэчаіснасці з рэалістычным і праўдзівым паказам жыцця дзяцей. У аснове сюжэта – фантастычная гісторыя, што адбылася са звычайным беларускім школьнікам Ванем Гардзеем, які не валодае ніякімі выключнымі здольнасцямі; з такім героем чытачу заўсёды проста і лёгка, бо ён не «прыгнятае» сваёй выключнасцю. Як і многія яго аднагодкі, Ваня можа быць гарэзлівым і непаслухмяным, але ён шчыры, непасрэдны, марыць аб незвычайных прыгодах, і ў гэтым заключаецца прыцягальнасць яго вобраза. Яшчэ ён вельмі любіць марыць, уяўляць розныя прыгоды, але тое, што з ім здарылася, непараўнальнае з самымі смелымі марамі. Трэцякласнік Ваня знаёміцца з Эрпідам (электронным робатам-паліглотам ізаляванага дзеяння), які прыбыў на Зямлю для вывучэння жыцця на гэтай планеце. Большменш справіцца з заданнем прышэльцу ўдалося дзякуючы толькі выдатнаму памочніку – Ваню Гардзею. Сустрэўшы іншапланецяніна, хлопец, не задумваючыся, аказвае яму дапамогу. Нават пропускі школьных заняткаў нікольки не кампраметуюць юнага героя, бо ён у гэты час ездзіў з госцем з іншай планеты ў Мінск. Ваня ўмее спачуваць чужой бядзе і выяўляе сапраўдную гасціннасць – адну з тыповых рыс нацыянальнага характару беларусаў. Актыўная грамадзянская пазіцыя галоўнага героя супрацьпастаўляецца абывацельскай псіхалогіі, эгаізму і абыякавасці Пеці Галабародзькі. Калі Ваню Гардзея можна назваць аўтарскім ідэалам, то ў вобразе Пеці ўвасоблены антыідэал. У адрозненне ад Вані Пеця

---

[1] *Місько, П.* Эрпіды на планеце Зямля / П. Місько // Акрабат у бутэльцы. Аповесці. Мінск, 1994. С. 406.

даволі эгаістычны і сквапны хлопец, які думае толькі пра сваю выгаду. Вытокі лепшых якасцей характару аднаго хлопца і недахопаў у выхаванні другога аўтар бачыць у іх сем'ях. П. Місько выказвае слушную думку, што найперш у сям'і закладваюцца асновы маральнасці чалавека. Галоўнаму герою аповесці было з каго браць прыклад: і з дзеда Двайнога Гардзея – былога партызана-разведчыка, і з бацькоў – сумленных і нястомных працаўнікоў-калгаснікаў. У творы сцвярджаецца, што духоўная сувязь пакаленняў з'яўляецца асновай здаровага мікраклімату ў сям'і. Нездарма вялікая заслуга ў тым, што браты Ваня і Лёня растуць сумленнымі і духоўна прыгожымі хлопцамі, належыць дзеду Двайному Гардзею. Менавіта ад дзеда юны герой навучыўся разважлівасці іназіральнасці, уменню знаходзіць выйсце з самых складаных сітуацый, на такіх дружных і працавітых сем'ях, падкрэслівае аўтар, і трымаецца моц і дабрабыт Беларусі.

У аснову аповесці пакладзена навуковая гіпотэза аб іншаземных цывілізацыях, што робіць твор надзвычай пазнавальным. Аднак аб'ектам мастацкага адлюстравання ў творы выступае не толькі і нават не столькі космас, колькі сучаснае жыццё беларусаў. Пісьменнік зусім не захапляецца тэхнічнымі магчымасцямі іншапланецян, а, наадварот, імкнецца абудзіць у чытача жаданне самаўдасканальвацца. Для мастака відавочна, што навукова-тэхнічны прагрэс не толькі дапамагае чалавеку жыць, але нярэдка і шкодзіць яго маральнаму і фізічнаму здароўю. Таму важным у ідэйным змесце твора з'яўляецца матыў імкнення да духоўнага прагрэсу нашага грамадства.

Аповесць П. Місько ствараласся ў часы актыўнага культывавання ідэі выкарыстання робатаў у многіх сферах дзейнасці чалавека. Аднак на прыкладзе Эрпіда аўтар праводзіць думку, што робаты могуць дапамагаць людзям у працоўнай дзейнасці, але замяніць чалавека яны не здольныя. Так, планета зялёнчыкаў, з якой прыляцеў касмічны разведчык, валодае высокаразвітымі тэхналогіямі, жыхары яе выкарыстоўваюць свае разумовыя здольнасці ў шмат разоў эфектыўней за зямлян, але іх мадэль грамадства не з'яўляецца ўзорам існавання. Як можна зразумець са зместу твора, навукова-тэхнічная рэвалюцыя стала адной з галоўных прычын амаль поўнай адсутнасці флоры і фауны на планеце, з якой прыляцеў

Эрпід. Разам з тым навуковыя адкрыцці зялёнчыкаў зрабілі магчымым поўнасцю рэгламентаваць іх жыццё. Яны растуць па зададзенай праграме, усе іх жаданні і думкі кантралююцца; інфармацыя, якой яны валодаюць, ніколі не падвяргаецца сумненню, таму цяжка зразумець, робаты яны ці жывыя істоты. Тым самым аўтар імкнецца пераканаць чытача, што мажлівасць праяўляць ініцыятыву, займацца творчасцю, жыць багатым духоўным жыццём намнога важнейшая за матэрыяльны камфорт. П. Місько выказвае вельмі слушную думку аб захаванні прыярытэту паміж развіццём навукі і тэхнікі (з аднаго боку) і маральным узроўнем грамадства (з другога). Па сутнасці, такая думка ў навуковай фантастыцы апошніх дзесяцігоддзяў становіцца дамінуючай. Скептычная ацэнка аўтарам аповесці «Эрпіды на планеце Зямля» ролі некаторых навукова-тэхнічных адкрыццяў у жыцці чалавека ўскосна ўказвае на Чарнобыльскую катастрофу (твор быў надрукаваны праз год пасля трагедыі).

Камп’ютэрныя тэхналогіі апошняга дзесяцігоддзя дазваляюць ствараць неверагодны віртуальны свет; у параўнанні з ім у аповесці П. Місько фантастычны антураж даволі сціплы, але ў гэтай знешняй прастаце і заключаецца эстэтычная вартасць такога навукова-фантастычнага твора для юнага чытача. У гэтай фантастычнай гісторыі аўтар на першы план паставіў актуальныя праблемы сучаснага грамадства. Пра гэтыя сур’ёзныя і важныя праблемы пісьменнік вядзе размову з адрасатам (твор найперш будзе цікавы падлеткам) проста і нязмушана, часта з дасціпным гумарам. Асаблівую актуальнасць у творы мае праблема экалагічнага выхавання падрастаючага пакалення. Ваня захапляецца самымі рознымі здольнасцямі новага сябра-робата, але яго планета без птушак і жывёл страчвае для хлопца ўсякую прыцягальнасць: «*Я сваю зямлю ні на што не прамяняю. Няўжо вам не хочацца мець хоць бы птушак? Салаўя паслухаць, жаваранка, шпака, зязюлю?*»[1]. Пісьменнік вучыць чытачоў не проста сузіраць прыгажосць прыроды, але і ахоўваць яе. Таму ў твор уключана гісторыя пра мядзведзя Мумрыка, у якой асуджаюцца спажывецкія адносіны да жывёл. Ваня з

---

[1] *Місько, П.* Эрпіды на планеце Зямля / П. Місько // Акрабат у бутэльцы. Аповесці. Мінск, 1994. С. 448.

Эрпідам, па сутнасці, дапамагаюць мядзведзю выжыць. Асаблівую трывогу за будучае чалавецтва выклікае аповед пра забруджванне наваколля. Эрпід II быў вельмі ўражаны абыякавасцю людзей да прыроды: «*Расліны не радуюцца дажджу... У паветры зменшылася колькасць двухокісу серы і сернага ангідрыду. Яны растварыліся ў вадзе, у дажджы. У зямлю прасочваюцца шкодныя кіслоты. Расліны курчацца і крычаць, нібы іх ашпарваюць кіпнем*»[1]. Экалагічныя праблемы, як сцвярджаецца ў творы, выкліканы найперш спажывецкай псіхалогіяй чалавека. Таму для аўтара адносіны людзей да прыроды становяцца ў тым ліку і мерай духоўнага здароўʼя грамадства.

Сустрэча Вані Гардзея з Эрпідам, відаць, была невыпадковай, яна дазволіла хлопцу паглядзець на зямное жыццё збоку і вызначыць у ім станоўчае і адмоўнае. Трывогу выклікаюць не толькі праблемы з экалогіяй, але і многія іншыя негатыўныя бакі жыцця зямлян: нежаданне берагчы сваё здароўʼе, несумленнасць часткі грамадства, частыя канфлікты паміж людзьмі. Асаблівую ўвагу пісьменнік звяртае на выхаванне ў чытача непрыняцця насілля і гвалту. Нездарма Эрпіда нядобра ўразілі шматлікія войны на Зямлі, эмацыйныя негатывы з якой улоўліваюцца нават з далёкага космасу. Ваню крыўдна за людзей, таму ён хоча прыхарошыць жыцццё беларусаў і ўтаіць яго негатыўныя бакі. У гэтым дзіцячым жаданні ярка выявіліся стэрэатыпы паводзін дарослых, для якіх сацыяльная няшчырасць нярэдка становіцца нормай паводзін. Аднак, нягледзячы на пэўныя недахопы жыцця зямлян, для галоўнага героя яго планета – дом, які ён ні на які іншы не прамяняе. Галоўная заслуга шматвекавога развіцця грамадства – гэта магчымасць свабоды выбару для чалавека, і ніякія добрыя намеры не могуць замяніць яе на поўную рэгламентацыю ўсіх сфер жыцця, як гэта было ў зялёнчыкаў.

Заклапочанасць аўтара выклікае і праблема сутыкнення людзей са штучным розумам, ці то зямнога, ці то іншаземнага паходжання. Насцярожанасць і скептыцызм аўтара выклікае магчымасць з дапамогаю новых тэхна-

[1] *Місько, П.* Эрпіды на планеце Зямля / П. Місько // Акрабат у бутэльцы. Аповесці. Мінск, 1994. С. 511

логій уздзейнічаць на інтэлект і псіхіку чалавека. Так, асаблівую трывогу выклікае здольнасць Эрпіда ўздзейнічаць на чалавека на адлегласці. Прыклады з Лёнем, з бацькамі Вані, з настаўнікам Алегам Максімавічам пераконваюць, што валоданне такімі здольнасцямі можа быць вельмі небяспечным.

Аповесць «Эрпіды на планеце Зямля» не толькі выхоўвае гонар за Беларусь і яе жыхароў, але паказвае чытачам прыгажосць і непаўторнасць нашай роднай мовы. Частае ўжыванне Ванем ідыём, трапных народных выразаў у размовах з Эрпідам нярэдка стварае камічны эфект. Схематызм робата дазваляе ўспрымаць толькі сухую інфармацыйную мову, таму час ад часу мы чуем: *«Інфармацыю не зразумеў»*. Наяўнасць у беларускай мове шматлікай колькасці фразеалагізмаў і прыказак падкрэслівае яе непаўторнасць, а таксама унікальнасць чалавечага мыслення.

Навукова-фантастычную аповесць П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля» сярод іншых твораў з фантастычным зместам вылучае шырокае выкарыстанне прыгодніцкіх элементаў, а таксама багаты выхаваўчы і пазнавальны патэнцыял. П. Місько − таленавіты пісьменнік-фантаст, які паспяхова працягвае ў нашай дзіцячай літаратуры традыцыі прыгодніцкай і фантастычнай кнігі Янкі Маўра.

Прыгодніцкія традыцыі нацыянальнай літаратуры П. Місько наследуе і ў аповесці «Грот афаліны» (1985) − творы для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Асноўныя калізіі ў аповесці разгортваюцца на фоне паступовага сталення дванаццацігадовага хлопца Янга Сінха, маленства якога прайшло побач з бацькамі і аднавяскоўцамі на адным з маляўнічых астравоў архіпелага Вясёлы, недзе паміж Індыяй і Інданезіяй. Страціўшы бацькоў, Янг драматычна-балюча спазнае таямніцы дарослага жыцця, мужна трывае паўсядзённыя нягоды, найвышэйшыя выпрабаванні ўласнага сумлення і годнасці, перажывае светлыя хвіліны першага кахання, гранічна даверліва ставіцца да кожнага, з кім зводзіць яго лёс, з-за чаго трапляе ў вельмі складаныя і небяспечныя сітуацыі. Высакародныя жыццёвыя ідэалы, бацькоўска-спадчынную філасофію быцця падлетку дапамагае захаваць і памножыць яго родны брат − дваццацігадовы Радж Сінх. Матэрыяльны дабрабыт, якім штодзённа карыстаюцца турысты-

іншаземцы, спараджае ў многіх мясцовых жыхароў і галоўнага героя аповесці шматлікія спакусы, штохвілінна выпрабоўвае кожнага на чалавечую вартасць. Жыццёвы лёс зводзіць Янга, Раджа і яго сябра-аднагодку Амара ў адным горадзе на востраве Рай, і яны годна выходзяць у людзі, займаюць сваё месца ў абсалютна новым для іх свеце.

Адной з цэнтральных у аповесці П. Місько «Грот афаліны» з'яўляецца праблема руйнавання векавога спадчыннага ладу жыцця, натуральных стэрэатыпаў у адносінах людзей да прыроды, зямлі, працы, традыцый продкаў, чалавечага суіснавання. Невялікае племя біргусцаў напаткала страшная трагедыя: султан Муту прадаў іх родны востраў Біргус амерыканцам, якія будуюць тут ваенна-марскую базу, а ўсіх жыхароў высяляюць на суседнюю зямлю. Апынуўшыся ў стане бежанцаў, біргусцы перажылі балючую драму. Калі раней іх матэрыяльны дабрабыт і паўсядзённыя клопаты былі абумоўлены выключна прыроднымі ўмовамі, то ў становішчы выгнаннікаў людзям давялося «ўжывацца» ў новае сацыяльнае асяроддзе гараджан, мяняць жыццёвы светапогляд, традыцыі, імператывы паводзін. Многія з ураджэнцаў Біргуса вымушаны былі жабраваць, наймацца на цяжкую працу, каб не памерці з голаду. Насельнікі архіпелага ўяўлялі сабой невялікія абшчыны, розныя паводле рэлігіі, сваяцкіх адносін. Гэтыя людзі ніколі не былі на іншых землях, любілі свой родны востраў — кут, дзе былі урны-жбаны з прахам продкаў, дзе жылі родзічы і суседзі, якія звычайна дапамагалі ў цяжкія хвіліны. У новых для сябе ўмовах большасць біргусцаў не страціла свайго лепшага духоўна-спадчыннага пачатку, але яны вымушаны былі ўсведамляць новую філасофію жыцця, прыходзіць да разумення, што іх ворагі не толькі янкі або мясцовы багацей-кітаец, а найперш вярхоўны кіраўнік султан Муту.

Праблемы маральнай разбэшчанасці, манкурцтва, выракання сваіх духоўных, радзінна-спадчынных каранёў у аповесці змястоўна раскрываюцца праз вобраз Пуола. Вызначальнымі ў характары гэтага маладога чалавека былі непрыстойнасць, напышлівасць, абвостраны эгаізм, амбіцыйнасць, адсутнасць пачуццяў сумлення, спачування, сваяцтва. Пуол палічыў, што зможа добра ўладкавацца і на другім востраве, а жыццё з родзічамі толькі

замінае яму разбагацець. Непачцівыя адносіны да старэйшых, непаслухмянасць да бацькоў трансфармаваліся ў хлопца ў хваравітае – праз прызму ўлады і грошай – стаўленне да людзей. Пуол пайшоў супраць волі бацькі і быў пракляты ім. Сірата Янг імкнецца выжыць у складаных для сябе абставінах, кіруючыся ідэаламі Дабра і Справядлівасці, мараллю сваіх бацькоў. Ён спасцігае складаныя законы жыцця паводле тых прынцыпаў, якім быў навучаны ў сям'і. Янг прывык ісці да людзей (тым больш знаёмых) з адкрытаю душою, шчырым даверам. Менавіта таму хціваму і крывадушнаму Пуолу ўдалося падмануць хлопца, выманіць у яго апошнія грошы і ўвязаць у непрыемную гісторыю з гангстэрамі. Янг непадобны да іншых дзяцей. Ён не быў летуценнікам, не меў той далікатнасці, рэфлексійнасці, якія ўласцівыя большасці яго аднагодкаў.

Неадольнае жаданне сустрэць свайго брата прыводзіць Янга на востраў Рай у дэльфінарый. З першых старонак аповесці мы заўважаем, што хлапчуку не заўсёды хапае пэўнай дарослаcці, памяркоўнасці, жыццёвай мудрасці, умення глыбока разбірацца ў людзях. Аднак пасля прыезду на новае месца ў многім яму пачынае дапамагаць Радж, які падказвае, як паводзіць сябе ў няпростых жыццёвых сітуацыях. Старэйшы брат, напрыклад, не раіць даводзіць да Джывы праўду пра смерць яго сына Пуола, вучыць клапатлівым і ўдзячным адносінам да Гугі, падкрэслівае, што *«шчасце Янга ўзрасло на няшчасці другога»*[1].

На Раі ў хлапчука з'явілася магчымасць некаторы час шыкоўна пажыць у гатэлі, прыслугоўваючы багатай італьянцы донне Тэрэзе і яе сабачку. Аднак падлетку з Біргуса не па душы бесклапотнае і сытае жыццё, яго вабяць дзіўныя істоты – афаліны. Не дбаючы пра часовыя выгоды, хлопец без ваганняў згаджаецца працаваць у Крафта. Яго не палохаюць знясільваючыя трэніроўкі, прыбіранне залаў дэльфінарыя, мыццё гідракасцюмаў. Галоўнае – ён побач з дэльфінамі. Афаліны, адчуўшы пяшчотныя да сябе адносіны, таксама палюбілі хлапчука, паслухмяна выконвалі сумесныя нумары. Акрамя таго, марскія жывёлы дапамаглі Янгу пазбавіцца пачуцця

[1]*Місько, П.* Грот афаліны / П. Місько. Мінск, 1985. С. 69.

адзіноты. Праца Сінха ў дэльфінарыі — таксама і наіўнае імкненне падлетка сцвердзіць сваю дарослась.

З цягам часу хлопец пачынае сур'ёзна і адказна ставіцца да працы, мяняе свае адносіны да людзей. Вынікам сапраўднага сталення Янга становіцца выпрацоўка ім уласнай жыццёвай пазіцыі, самастойнага погляду на рэчы і ўчынкі людзей, умення зрабіць самаацэнку ўласным паводзінам, пашырэнне кругагляду і фарміраванне цэласнага светапогляду. У фінальных эпізодах твора падлетак паўстае смелым і адначасна абачлівым, назіральным і кемлівым, таварысцкім і спагадлівым. Маральна і духоўна расце Янг і ў каханні да Натачы. Хлопцу імпануе знешняя прыгажосць сяброўкі, прываблівае яе багаты і высакародны ўнутраны свет. Дзяўчына дае Янгу прыклад адданасці ў сяброўстве, вучыць быць чуйным да чужога болю. Нават знаходзячыся ў вымушаным палоне ў гроце, хлапчук у першую чаргу клапатліва спачувае свайму сябру Мансуру, якога некалі кантузіла падводным выбухам на востраве Біргус. Янг перажывае за Абдулу і Натачу, за дэльфінаў, якія апынуліся ў пастцы.

У братоў Янга і Раджа шмат агульнага. Яны выраслі ў адной сям'і. Відаць, таму ў хлопцаў падобныя рысы характару, унутраны свет. Яны аднолькава чуйныя да чужога болю, смелыя, кемлівыя, абачлівыя, назіральныя. Працуючы разам у дэльфінарыі, яны зарэкамендавалі сябе паслухмянымі, паслужлівымі, дбайнымі працаўнікамі. Разам з тым аўтар падкрэслівае Янгаву непрыстасаванасць да гарадскога жыцця. У крытычных сітуацыях хлапчуку дапамагае вынаходлівасць. Напрыклад, каб падаць вестку пра сябе, трапіўшы ў грот, ён выпусціў у ваду звязаныя з парванай блузкі вузельчыкі з зеллем. Радж больш спрактыкаваны, самастойны, у яго выразна акрэсленае пачуццё годнасці. У адрозненне ад свайго брата, Радж больш замкнёны ў сабе, не жадае дзяліцца сваімі клопатамі з іншымі, ён перакананы атэіст. Браты Сінхі вылучаюцца сярод іншых герояў твора і сваімі адказна-беражлівымі адносінамі да прыроды. Характарыстыка двух братоў падаецца як бы ў адной настраёвай танальнасці з вобразамі дэльфінаў.

Пісьменнік пазнавальна, ёміста малюе знешні выгляд марскіх істот. Афаліны (бутэльканосы) — дэльфіны буйных памераў, да трохсот кілаграмаў, незвычайна прыго-

жыя, чорна-белага колеру. Яны дзіўна шчабечуць (накшталт таго, як лямантуюць вераб'і), не любяць пячор і шчылін. Афаліны, аднак, перасільваюць свой прыродны інстынкт і выратоўваюць Янга з грота. У дэльфінаў развітае адчуванне радзіннасці і калектыву. Падчас марскога палявання Радж становіцца сведкам, як дарослая самка дэльфінаў ускочыла ў сетку да свайго дэльфіняці (дзіця для яе было даражэйшым за волю). П. Місько выкарыстоўвае ў творы прыём псіхалагічнага анімалізму: дакладна перадае псіхалогію афалін – аднаго з самых міралюбна-добразычлівых відаў дэльфінаў, якія, патрапіўшы ў сетку, адразу спыняюць спробы ўцячы, нібы не разумеючы, што ад чалавека можна таксама чакаць зла. Аднак, на жаль, не ўсе людзі былі гатовы прыйсці, падобна Раджу, ім на дапамогу. Афаліны – высакародныя, удзячныя істоты, з абвостраным адчуваннем справядлівасці. Так, Бобі ў знак цёплых, спагадлівых да сябе адносін вынес Янгу з дна грота цацку – залатога самародка, падобнага на дракончыка. А пасля забойства Судзіра дэльфіны вырашылі загладзіць сваю віну самагубствам, выскачыўшы з разгону на пясок.

У аповесці «Грот афаліны» глыбока асэнсаваны экалагічныя праблемы. Аўтар падкрэслівае, што ва ўмовах сучасных тэмпаў прагрэсу ўзровень духоўнага развіцця чалавецтва няўхільна зніжаецца. Гэта ў сваю чаргу спараджае абыякавыя, спажывецкія адносіны да прыроды, шматлікія экалагічныя катастрофы. Празаік свядома заканчвае аповесць трагічнай сцэнай забруджвання вострава Рай нафтай; пасля апошняй фразы ставіць шматкроп'е: страшная катастрофа зраўняла ўсіх людзей, якія апынуліся ў невядомасці перад будучыняй. У творы гучыць аўтарская думка-пакаянне перад людзьмі, што жывуць у нястачы недзе ў далёкіх краінах, перад усім чалавецтвам і Прыродай.

Папоўняць скарбонку любімага дзіцячага чытання і літаратурныя казкі П. Місько, адрасаваныя дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Найбольш вядомымі казкамі гэтага мастака слова з'яўляюцца «Старамодны заяц», «Сарока і дзяцел», «Сінявокае мышаня», «Прыйдзі, дзень-залацень!». Несумненную сувязь з народным казачным эпасам маюць усе гэтыя творы: і напісаныя на аснове беларускіх народных казак, і творы з

уласна аўтарскім сюжэтам. Выкарыстанне традыцый народнай казкі ў сюжэтапабудове, у матывах, у выкарыстанні мастацкіх сродкаў і прыёмаў, у абмалёўцы вобразаў цалкам абумоўлена эстэтычнай прыродай літаратурнай казкі – усё гэта ўзнімае ідэйна-мастацкую вартасць твораў гэтага мастака слова.

Найбольш арыгінальная ў жанравых адносінах казка П. Місько «Прыйдзі, дзень-залацень!» (1993). У ёй пісьменніку ўдалося спалучыць у адным творы сюжэты дзесяткаў беларускіх народных казак («Курка-рабка», «Як конь стаў старэйшым ад льва», «Кот, певень і ліса», «Каза Дарота», «Піліпка-сынок», «Дзедава рукавічка», «Як лісу ашукала варона», «Разумная дачка» і інш.). Аднак гэты твор не штучнае паяднанне розных сюжэтаў, а мастацкая цэласнасць з прадуманай кампазіцыяй. Важнымі кампазіцыйнымі дэталямі, якія надаюць казцы ідэйна-мастацкую завершанасць, з'яўляюцца зачыны і канцоўкі да кожнай казачнай гісторыі. Гэта адзіная спроба ў сучаснай беларускай літаратуры сінтэзаваць у мастацкім палатне вялікай эпічнай формы розныя жанравыя разнавіднасці вусна-народнага казачнага эпасу: казак пра жывёл, чарадзейных і сацыяльна-бытавых. Аўтар не ставіў мэту дакладна ўзнавіць сюжэты вядомых народных казак, ён камбінаваў фальклорныя творы, часта мяняючы фабулу для ідэйна-мастацкай цэласнасці ўсяго твора.

Дынамічная імклівасць і зграбнасць сюжэта, нягледзячы на яго разгорнутасць, дасягаецца ў гэтым творы драматычна-дэтэктыўнымі калізіямі, пастаяннай барацьбой герояў са злом. Аднак знешняя эфектнасць толькі дапамагае захаваць традыцыйную казачную абраднасць. Аўтар прыцягвае ўвагу чытача не толькі фантастычнай выдумкай, але і дакладнасцю, пераканальнасцю вобразаў, высокай ідэйнасцю. Мастацкая цэласнасць гэтай аповесці-казкі ў многім залежыць і ад наяўнасці ў ёй героя-апавядальніка, які выступае ў вобразе дзеда Аўласа або проста нейкага ўмоўнага персанажа. Тым не менш гэты намінальны казачнік спалучае ў адзінае цэлае многія казачныя гісторыі, якія ў фальклоры выступаюць самастойнымі і завершанымі творамі.

У ідэйна-мастацкай і сюжэтна-вобразнай структуры казкі П. Місько галоўным з'яўляецца станоўчы герой. Вобраз асілка Ваняткі намаляваны ў традыцыях бела-

рускіх народных гераічных казак. Адпаведна паэтыцы вусна-народнага казачнага эпасу «*хлопчык-удальчык ростам з пальчык*» нарадзіўся дзіўным чынам: курка-раба знесла яйка і баба Параска насіла яго пад пахаю да той пары, пакуль з яго не вывеўся будучы асілак. У гэтым незвычайным нараджэнні выкарыстаны міфалагічныя ўяўленні пра сродкі чарадзейнай магіі. Са старажытных часоў і да сучаснасці ў казачным эпасе ў той ці іншай ступені выяўляліся міфалагічныя ўяўленні нашага народа, таму і аўтары айчынных літаратурных казак нярэдка выкарыстоўвалі міфалагічныя матывы. П. Місько стварае вобразы, якія цесна звязаны са славянскай міфалогіяй: цмока, што вылупіўся з яйка, і ведзьмаў. Аднак у казцы «Прыйдзі, дзень-залацень!» дзейнасць гэтых істот атаясамліваецца не столькі з фантастычнымі сіламі, колькі з панскім прыгнётам. Тым не менш крыўдзіцелі народа выступаюць не толькі ў абагульненых вобразах, але і ў канкрэтным персанажы – прыгнятальніку пану Пузадзёрскім, які ў многіх эпізодах не менш крыважэрны, чым цмок і ведзьмы. Барацьба асілка Ваняткі з крыўдзіцелямі народа за справядлівасць робіць яго зразумелым і блізкім юным чытачам. Такі герой з'яўляецца ідэалам і прыкладам для юных чытачоў: ён смелы, шчыры, упэўнены ў сабе, дапамагае безабаронным і пакрыўджаным. Вобраз асілка Ваняткі паказаны П. Місько ў развіцці: хлопец увесь час вучыцца, прагна ўбірае звесткі пра свет і людзей, таму хутка сталее. Паказальны эпізод, у якім асілак хоча навучыцца чытаць (гэта яму ўдаецца), – тым самым падкрэсліваецца значнасць, важнасць ведаў у жыцці чалавека. У творы звяртаецца ўвага на тое, што дасціпным розумам можна перамагчы любую гіпербалічную сілу. Таму менавіта з дапамогай вынаходлівасці і кемлівасці былі пераможаны ворагі, а сілу Ванятка выкарыстоўваў у мірнай і стваральнай працы. Высакароднасць і высокая маральнасць Ваняткі дапамагаюць яму здабыць не толькі грамадскае, але і асабістае шчасце: хлопец знаходзіць сваю каханую.

Нягледзячы на тое што ў аповесці-казцы «Прыйдзі, дзень-залацень!» выкарыстаны элементы розных разнавіднасцей народнай казкі, твор найбліжэй да чарадзейных гераічных казак. У гэтым мастацкім палатне выкарыстаны чарадзейныя вобразы-рэчы (дудка-весялушка,

жаронцы-шмаргонцы, гарошыны, торба і інш.), прысутнічаюць чарадзейныя істоты (акрамя пачвар, гэта незвычайны баран і конь). Не абыходзіцца ў аповесці і без чарадзейных ператварэнняў, найбольш знакавае з якіх – павелічэнне маленькага Ваняткі, калі ён улазіў каню ў правае вуха. Аднак сапраўдны рост, толькі не фізічны, а маральны, выяўляе хлопец сваёй гатоўнасцю застацца на ўсё жыццё маленькім дзеля шчасця і свабоды свайго народа. Такая высакароднасць героя была ўзнагароджана (у казках дабро заўсёды перамагае зло): Ванятка ператвараецца ў чалавека звычайнага росту.

З іншых герояў твора неабходна выдзеліць звяроў і птушак, якія дапамагаюць перамагчы зло (верны конь, Сабака Брахун, каток Вуркаток, пеўнік Пяюн, мышка-нарушка Шэрае Брушка). Аўтар, каб пазбегнуць спрошчанасці ў абмалёўцы гэтых традыцыйных герояў казак, робіць незвычайны ход: паказвае прыклад сапраўднага сяброўства і агідную здраду. Алегарычнымі вобразамі мастак падкрэслівае складанасць чалавечых узаемаадносін, дзе часта суіснуюць высакароднае і нікчэмнае.

Казачны антураж у аповесці-казцы «Прыйдзі дзень-залацень!» дапамагае выгадна выявіць выключны выхаваўчы пафас твора. На першы план аўтар паставіў высокую патрыятычную ідэю ў спалучэнні з выхаваннем у юных чытачоў лепшых маральных якасцей. Таму Ванятка – патрыёт сваёй зямлі, ён любіць і паважае бацькоў, спачувае ўсяму жывому, умее кахаць і сябраваць. У П. Місько дыдактызм і павучальныя інтанацыі – дамінуючыя рысы казачнага жанру – гарманічна спалучаюцца з высокай ідэйнасцю і натуральна ўпісваюцца ў мастацкую тканіну твора, не ператвараючыся ў залішняе і не прыхаванае маралізатарства. Казка вучыць гасціннасці, працавітасці, любові да роднай мовы, уменню абараняць свой гонар. Вырашаючы пэўныя педагагічныя задачы, мастак у некаторых выпадках перайначвае сюжэты народных казачных гісторый. Напрыклад, зусім паіншаму гучыць казка пра каравайчык-катышок, якога праглынула ліса і пасля гэтага вымушана была хадзіць на пярэдніх лапах. У дадзеным кантэксце, падкрэслівае аўтар, такое пакаранне з'яўляецца зусім натуральным: «*Вось да чаго ашуканства, прагнасць і хітрасць даводзяць. Не будзем мы яе шкадаваць, няхай так па-*

*ходзіць*»[1]. Але ў другім эпізодзе з лісой Лукер'яй ужо выхоўваецца літасць, калі яе пакаралі, то малога Верамеечка пашкадавалі: «*Хай сядзіць, малы яшчэ, няма ў яго ніякай віны*» [27]. Пісьменнік таксама асуджае чалавечую прагнасць і няўдзячнасць, увасобленую ў вобразе бабы Параскі, якая падгаворвала дзеда злавіць гусей – выратавальнікаў Ваняткі.

Своеасаблівы падыход у вырашэнні выхаваўчых задач выяўляецца ў П. Місько і ў пэўных элементах кампазіцыі. Нярэдка павучальныя ідэі гучаць у зачынах і канцоўках, якія звязваюць розныя гісторыі ў адзінае цэлае. Напрыклад, у гісторыі «Не капай яму другому...» не толькі назва, але і зачын маюць цесную сувязь з беларускімі прыказкамі, таму не пазбаўлены дыдактычнага сэнсу: «*Хату ад парога не мятуць, карову ззаду не дояць. Таму і мы будзем расказваць па парадку, дзе што і як ішло*» [176]. Канцоўка з гісторыі «На ўсякае хаценне майце цярпенне» вучыць дзяцей разважлівасці і ўдумліваму чытанню кніг: «*Добра што вы не проста слухаеце, а думаеце над казкамі. Думаць карысна, і ёсць пра што на свеце падумаць,* – *сказаў дзед Аўлас.* – *Але ведайце, і да верабейкі было так на свеце – вол ваду піў, агонь ваду тушыў, каршак курэй драў... Спрадвеку такая завядзёнка, і нічога не перайначыш*» [199]. Праз увесь твор праходзіць ідэя фарміравання ў чытача маральнага ідэалу. Нават у назве аповесці-казкі падкрэсліваецца адна з асноўных праблем твора: пошукі шчаслівай долі і вынішчэнне несправядлівасці. Дзень-залацень – гэта сімвал імкнення чалавека да справядлівасці, устанаўлення часу, калі можна будзе сумленна працаваць і ніхто нікому не будзе нядобрае рабіць.

Для казкі «Прыйдзі, дзень-залацень!» характэрна адзінства ідэйнага і стылявога гучання. Аўтар здолеў пазбегнуць фармальнага падыходу пры выкарыстанні шырокага спектру эстэтыкі народнай казкі. У аповесці традыцыйныя элементы паэтыкі народнай казкі – зачыны, канцоўкі, эпітэты, метафарычныя параўнанні – ствараюць непаўторную для літаратурнай казкі стылістыку. У П. Місько, напрыклад, зачын – гэта не толькі сродак

---

[1]*Місько, П.* Прыйдзі, дзень-залацень / П. Місько. Мінск, 1993. С. 43. Далей спасылкі на гэта выданне даюцца непасрэдна ў тэксце: у дужках будзе прыводзіцца нумар старонкі.

увядзення чытача ў непаўторны казачны свет, але і наладжванне кантакту з ім, каб размова была лёгкай і нязмушанай. Ужо самы першы ў аповесці зачын стварае даверлівую атмасферу камунікацыі «аўтар – твор – чытач», дзе не апошняя роля адводзіцца гумарыстычным элементам: «*Даўно гэта, мае дзеткі, было. Па ўсім свеце гуло, у паветры насілася, да нас закацілася. Каля Тпру-Таракані было, так звалася сяло. Паспрабуем разам вы-ра-гавыць... Ой, не, не так! Вы-га-ва-рыць... Во... Тпру-Таракань... Ага, цяпер правільна*» [5]. У зачыне аўтар можа патлумачыць незразумелыя словы: «*А помніце, дзеткі, што хлопчык-удальчык не дадому павярнуў, а ўбок!? Гэта ён у ведзьмін яр паехаў.*

*Яр – гэта такая даўжэзная, на вярсту яма, глыбокае і шырокае вырвышча*» [28]. У творы можна сустрэць у якасці зачыну загадку: «*Чорная карова ўсіх пабарола, белая ўстала – усіх пападымала*» [33]. Можна сустрэць у аповесці і зачын-прыкмету, які вызначае пафас далейшай гісторыі: «*Устала раніцаю баба з левай нагі. А ўсім вядома, хто так устае, цэлы дзень будзе нядобрыцца яму. І сабе настрой сапсуе, і ўсім*» [60]. Арыгінальна выкарыстана ў якасці зачыну скорагаворка: «*А ці ўмееце вы скорагаворкі прагаворваць? Вось такую, напрыклад: тры дрывасекі, тры дрываколы на трох дварах дрэвы калолі, дзе добра пераколвалі, дзе толькі папярапалавіньвалі...*» [186]. Для сэнсавай сувязі розных сюжэтных ліній у некаторых выпадках П. Місько спалучыў канцоўку і зачын: «*Ах, як не хочацца канчаць гэту казку. Але трэба, бо сядзець будзем без хлеба. А хто цікавіцца, што было далей, то сядайце ў другую каляску, паедзем у новую казку*» [80]. Канцоўкі ў аповесці «Прыйдзі дзень-залацень!» вытрыманы ў традыцыі вусна-народнага казачнага эпасу: «*Гэтай казцы канец, а хто слухаў – маладзец*» [11]. Аўтар як вопытны казачнік і адначасова педагог не толькі намякае на плату за казку («*Во збаяў вам яшчэ адну казку. Дайце за гэта пірог – і я за парог*» [38]), але і гаворыць аб узнагародзе дзяцей-слухачоў за ўважлівасць і паслухмянасць («*Тут і канчаецца гэтая казка. А хто слухаў, таму абаранкаў вязка*» [20]).

Для таго, каб рэцыпіенты не былі пасіўнымі ўспрымальнікамі твора, мастак выкарыстоўвае элементы гульні. Чытачам прапаноўваюцца скорагаворкі, якія ў

займальнай форме дапамогуць удасканаліць тэхніку маўлення (*«Каваль каваў каня, конь кавалю капытом, каваль каню колам»* [19]), а таксама загадкі, якія не толькі развіваюць лагічнае мысленне, але і ўдасканальваюць навыкі лічэння (*«Ой, дык пан... абяцаў два мяшкі жыта і адзін пшаніцы. Потым яшчэ два мяшкі жыта і два пшаніцы. Колькі ж усяго будзе мяшкоў жыта і пшаніцы?»* [128]). П. Місько звярнуўся таксама да жанру песні, што паўплывала на мілагучнасць, лірычнасць, эмацыйную экспрэсіўнасць аповеду. Напрыклад, песенка з гісторыі «Не кайся, рана ўстаўшы» нясе ў сабе моцны зарад аптымізму: *«Знойдзем выхад! Зможам гора! // Сёння лепш, як мелі ўчора, // Заўтра будзе шчэ ляпей – // Глядзі ўперад весялей»* [17]. Аповесць-казка П. Місько вылучаецца таксама інтанацыйным багаццем, яркасцю і сакавітасцю мовы. У творы часта сустракаюцца прыказкі і прымаўкі, трапныя афарыстычныя выслоў'і – гэта дае добрую магчымасць юным чытачам далучыцца да бязмежнага патэнцыялу беларускай мовы. Шырокае выкарыстанне аўтарам багаццяў народна-паэтычнай творчасці спрыяе развіццю ў чытачоў эстэтычнага густу. Фальклорныя казачныя традыцыі дазволілі пісьменніку ўдасканаліць наватарскую форму і змест аповесці-казкі, узняць гэты жанр на вяршыню мастацкай дасканаласці.

Усе казкі П. Місько закранаюць актуальныя праблемы выхавання юнага пакалення: яны даюць дзецям элементарныя паняцці пра дабро і зло, вучаць справядлівасці, бескарыслівасці, спачуванню і ўзаемадапамозе. Напрыклад, у казцы «Старамодны заяц» аўтар стварае цікавую і арыгінальную легенду: чаму ёсць зайцы белыя і шэрыя. З дапамогай гумарыстычных і займальных элементаў мастак вучыць юных чытачоў працавітасці і адказнасці, уменню ахвяраваць сваімі інтарэсамі дзеля дапамогі іншым. Аўтар на вобразе зайца-краўца ўслаўляе чалавечую шчодрасць і бескарыслівасць, уменне спачуваць чужой бядзе. Казка «Сарока і дзяцел» таксама напоўнена глыбокім дыдактычным сэнсам. На прыкладзе сарокі і дзятла пісьменнік паказвае, як важна рэальна ацэньваць свае здольнасці, каб не трапіць у недарэчную сітуацыю. Для маленькіх чытачоў такія павучальныя гісторыі будуць мець вялікае выхаваўчае значэнне.

Дзіцячыя казкі, прыгодніцкія і фантастычныя творы П. Місько сталі сапраўднай класікай, а аповесць «Грот афаліны» ў 1989 г. на ўсесаюзным літаратурным конкурсе была адзначана спецыяльным дыпломам. Высокі ідэйна-мастацкі ўзровень твораў гэтага мастака слова найперш абумоўлены тым, што пісьменнік заўсёды бачыць перад сабой вельмі важную педагагічную задачу: выкарыстаць талент у высакароднай справе – выхаванні высокадухоўнай асобы, чалавека з вялікай літары.

## Тэма 8.3. НІЛ ГІЛЕВІЧ

### (Ніл Сымонавіч Гілевіч)

### (1931)

Жыццёвы шлях, які прайшоў **Ніл Сымонавіч Гілевіч**, па-сапраўднаму ўражвае: ад вясковага хлапчука з шматдзетнай сям'і, вучня Гайнаўскай сямігодкі да прафесара (1978), заслужанага дзеяча навукі Беларусі (1980), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1980) і, урэшце, народнага паэта Беларусі (1991). Гэта далёка не ўсе высокія званні і ўзнагароды, якія мае гэты шырокавядомы пісьменнік за сваю літаратурную і грамадскую дзейнасць. Ён быў адзначаны дзяржаўнымі ордэнамі і медалямі ў савецкі час, у незалежнай Беларусі ўганараваны медалём Ф. Скарыны. За перакладчыцкую працу Н. Гілевіч атрымаў балгарскі ордэн Кірылы і Мяфодзія І ступені, ордэн Югаслаўскай зоркі са стужкай. Ён стаў лаўрэатам Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Хрыста Боцева. Усе гэтыя ўзнагароды замежных краін – прызнанне асабістых заслуг пісьменніка, яго таленту і майстэрства – адначасова з'яўляюцца сведчаннем годнасці, высокага аўтарытэту і шанавання беларускай літаратуры ў свеце.

Творчая дзейнасць Н. Гілевіча надзвычай шматгранная: паэт і перакладчык, фалькларыст і літаратуразнаўца, крытык і публіцыст, драматург і дзіцячы пісьменнік. А да гэтага трэба дадаць, што ён заўсёды багата часу аддаваў грамадскай працы, пачэснай асветніцкай, культурна-адраджэнскай дзейнасці. Дастаткова згадаць: Н. Гілевіч працаваў першым сакратаром Саюза пісьменнікаў Беларусі (1980–1989), старшынёй пастаяннай